Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 САКАВІКА 2023 г. ЧАЦВЕР № 50 (29930)

РУХАЦЬ НАВУКУ НАПЕРАД ПАВІННА МОЛАДЗЬ

ЧЫРВОНКА

З МОВАЙ ПАЗНАЁМІЦЬ «ЯСЬ»

ЧЫРВОНКА

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:

«Што датычыцца айчыннай вакцыны ад COVID-19, мы ў красавіку павінны атрымаць першы доследна-вытворчы ўзор, які пойдзе на даклінічныя і клінічныя выпрабаванні, каб вакцына была зарэгістравана да канца гэтага года».

КАРАТКА

• **Беларускія лёгкаатлеткі выйгралі сем медалёў на спаборніцтвах у Іране.**

• Выстаўка да 100-годдзя стварэння Дома-музея I з'езда РСДРП адкрылася ў цэнтры Мінска.

• **Больш за 160 тыс. беларусаў атрымала біяметрычныя дакументы.**

• Беларусь і Бразілія дамовіліся аб будаўніцтве двух заводаў па зборцы трактароў МТЗ.

• **Кангрэс маладых вучоных Беларусі і Расіі пройдзе ў НАН з 27 сакавіка да 1 красавіка.**

• Савет ЕЭК разгледзіць пашырэнне выкарыстання ў ЕАЭС нацвалют ва ўзаемных разліках.

• **Электронныя інструменты БУТБ будуць прымяняцца ў прамысловым сектары Ніжагародскай вобласці.**

МОЦНАЯ ДЫНАСТЫЯ ДРАЗДОВЫХ

Фота БелТА

У сям'і начальніка Круглянскага РАУС Аляксандра ДРАЗДОВА чацвёра сыноў. Двое з іх, Сяргей і Іван, пайшлі па слядах бацькі. Сяргей — інспектар ДПС Магілёўскага РАУС, а 19-гадовы Іван — дзяжурны ІЧУ Бялыніцкага РАУС. Малодшыя, дзетсадавец Дзіма і першакласнік Міша, з дзяцінства бяруць прыклад з бацькі. Для ўсіх членаў сям'і патрыятызм і гонар з'яўляюцца не проста словамі. Пачуццё абавязку і любоў да Радзімы, прыстойнасць — жыццёвыя прынцыпы гэтай сям'і.

Спажывец

Родныя рэчы

Пабылі ў першым канцэпт-стор «Да дому»

Пачатак гэтай вясны адзначыўся адкрыццём першай крамы «Да дому» — у Dana Mall, на трэцім паверсе. Адкрыццё атрымалася досыць яркім і шматабяцальным: па-першае, стараннямі журналістаў, якія шырока асвятлялі падзею, а па-другое, дзякуючы таму, што стварэнне новай сеткі тавараў для дому айчыннай вытворчасці (наш адказ Zara Home, Jysk і IKEA) «Беллегпрамам» анансавалася яшчэ паўгода таму — і вось пачатак пакладзены. З моманту адкрыцця магазін адпрацаваў амаль два тыдні. А значыць, можна падводзіць першыя вынікі: ці цікавы ён беларускаму спажыўцу і ці ёсць у ідэі будучыня. СТАР. 3

Перспектыва

Шанхайскі расклад

Чым прываблівае ШАС?

Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва — найбуйнейшая сусветная рэгіянальная платформа ўзаемадзеяння. Пра яе стварэнне было абвешчана 15 чэрвеня 2001 года ў Шанхаі Казахстанам, Кыргызстанам, Кітаем, Расіяй, Таджыкістанам і Узбекістанам. Да гэтага краіны працавалі ў фармаце «Шанхайскай пяцёркі» — без Узбекістана. Палітычнае аб'яднанне было заснавана на Пагадненні аб умацаванні даверу ў ваеннай галіне ў раёне граніцы (Шанхай, 1996 год) і Пагадненні аб узаемным скарачэнні ўзброеных сіл у раёне граніцы (Масква, 1997 г.). Цяпер яе членамі з'яўляюцца восем краін (акрамя заснавальнікаў, гэта Індыя і Пакістан, якія таксама далучыліся ў 2017-м) з агульным насельніцтвам больш за тры мільярды чалавек, што фарміруюць чвэрць глабальнага ВУП. У Беларусі, Афганістана, Ірана і Манголіі — статус дзяржавы-назіральніка. Акрамя таго, Азербайджан, Арменія, Егіпет, Камбоджа, Катар, Непал, Саудаўская Аравія, Турцыя і Шры-Ланка — партнёры па дыялогу. СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2023 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

«Добра дапамагаць таму, хто сам стараецца нешта зрабіць»

Такімі словамі Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падкрэсліла важнасць работы органаў мясцовай улады ў вырашэнні пытанняў на месцах, у прыватнасці зямельна-маёмасных праблем, падчас рабочай сустрэчы ў Стоўбцах. Яна падкрэсліла, што людзям неабходна ведаць пра існаванне адзінага рэестра пустых дамоў, які з 1 студзеня дзейнічае ў краіне, каб яны маглі набываць дамы і ўчасткі замест таго, каб уладам прыходзілася зносіць лядашчае нічыйнае жыллё. Сенатар дадала таксама, што, магчыма, надышоў час заняцца праблемамі не толькі жылых дамоў, але і пераходзіць да адміністрацыйных будынкаў у малых населеных пунктах, дзе яны ніколі нікім не будуць выкарыстоўвацца, аднак выгляд мястэчак пры гэтым псуюць.

Раней многія рашэнні трэба было прымаць на рэспубліканскім узроўні, а цяпер гэта на месцах могуць зрабіць тыя людзі, якія працуюць у органах мясцовага самакіравання. Для гэтага створаны ўсе ўмовы. «У Стоўбцах мы ўбачылі, як сёння можна зрабіць сацыяльную сферу і рэалізоўваць эканамічныя задачы. І гэта сумесная работа ўлады і людзей, бо вынік ёсць там, дзе працуюць сумесна», — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Падчас рабочага візіту яна наведала шматфункцыянальную грамадскую прастору «Кінатэатр «Беларусь», існаванне якой стала магчымае па прапанове мясцовай моладзі, якой не хапала падобнага цэнтра; азнаёмілася з аб'ектамі сацыяльнай інфраструктуры Стоўбцаў; пабывала ў раёне індывідуальнай забудовы мікрараёна Паўночны аграгарадка Заямнае. Выканала Наталля Качанава і святочную місію: у Дзень Канстытуцыі разам з Аляксандрам Турчыным, старшынёй Мінаблвыканкама, яна ўручыла пашпарты мясцовай моладзі. Атрымаць першы «дарослы» дакумент разам з Канстытуцыяй з рук высокіх гасцей змаглі выдатнікі вучобы і актывісты грамадскага жыцця.

— Асноўная сацыяльная палітыка нашай дзяржавы — клопат пра чалавека — рэальна ўкараняецца ў жыццё. Мы — прававая дзяржава, пра што сведчыць Канстытуцыя, і мы заўжды жылі і будзем жыць па законах, — падкрэсліла сенатар. — Навелы і прапановы ў галоўны дакумент краіны, якія летась былі адобраны і падтрыманы грамадзянамі падчас рэферэндуму, бачым, на карысць народу і дзяржаве. Менавіта людзі прапаноўвалі, што трэба ўнесці ў Канстытуцыю, каб наша краіна захавала свой суверэнітэт і незалежнасць. Нашы гістарычныя і традыцыйныя каштоўнасці закладзены ў абноўленай Канстытуцыі.

Падчас пасяджэння Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі «Аб сумеснай рабоце органаў мясцовага кіравання і самакіравання па вырашэнні праблемных пытанняў у галіне зямельна-маёмасных адносін і навядзення парадку на зямлі» ў Стоўбцах раёны прадставілі свой вопыт у вырашэнні зямельных пытанняў: уводу ў севазварот, продажу маёмасці іншым карыстальнікам або зносу.

Наталля Качанава падкрэсліла важнасць такіх сустрэч з органамі мясцовага самакіравання ў розных кутках краіны, паколькі падчас іх можна не толькі азнаёміцца з вопытам работы ўлады з людзьмі, але і пачуць праблемы, якія існуюць у рэгіёнах. «Раён уразіў мяне добраўпарадкаванасцю, чысцінёй, парадкам, тым, як тут вядзецца работа па ўцягванні ў абарот пустых будынкаў», — падзялілася яна і дадала, што прыняла да ўвагі многія прапановы, якія прагучалі падчас сустрэч. Магчыма, у краіне з часам з'явіцца і гэткая інтэрнэт-крама старога жылля, дзе кожны зможа выбраць сабе аб'ект да густу. Пра ўсё гэта больш падрабязна мы раскажам у наступным нумары «Мясцовага самакіравання».

Ірына СІДАРОК.

Адкрыты дыялог на пазітыве

Ігар Сергеенка ўручыў пашпарты юным грамадзянам

Для некаторых школьнікаў Дзень Канстытуцыі прайшоў асабліва ўрачыста. Найлепшыя прадстаўнікі беларускай моладзі атрымалі пашпарты з рук кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігара СЕРГЕЕНКІ і першага сакратара ЦК БРСМ Аляксандра ЛУК'ЯНАВА падчас усебеларускай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!».

Ігар Сергеенка, звяртаючыся да падлеткаў, расказаў ім пра свята, а таксама пра абнаўленні ў Канстытуцыі, прынятыя на ўсенародным рэферэндуме ў 2022 годзе.

— Глыбока сімвалічна тое, што прысутная тут моладзь з розных рэгіёнаў краіны сёння атрымлівае свой першы сур'ёзны дакумент — пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. — З атрыманнем пашпарта ў вас з'яўляюцца не толькі правы, але і абавязкі, і адказнасць перад краінай, родным домам, малой радзімай. Затым паступова прыходзіць і разуменне вялікай Радзімы, якой мы павінны і можам ганарыцца, — адзначыў Ігар Сергеенка. Ён асабліва падкрэсліў, што датычнасць да Радзімы пачынаецца таксама з ведання гісторыі сваёй краіны

Таксама ён адзначыў, што ў Беларусі створаны выдатныя ўмовы для развіцця кожнага: бясплатная школьная і вышэйшая адукацыя, магчымасць свабодна выбіраць прафесію і браць удзел у розных праграмах, конкурсах. Былі б толькі жаданне і ініцыятыва.

З юнымі грамадзянамі краіны Ігар Сергеенка правёў адкрыты дыялог, падчас якога школьнікі задавалі пытанні, што іх сапраўды хвалююць: аб сітуацыі ў краіне, аб вучобе, аб выбары прафесіі, аб патрыятычных акцыях. Адказваючы на іх, Ігар Сергеенка падкрэсліў, што сёння мала добра вучыцца. Трэба пастаянна пашыраць свой кругагляд, каб разбірацца ў рэаліях жыцця. «Мы павінны знаходзіць пазітыў у нашых дзеяннях і нашым жыцці. Тым больш што пазітыву нашмат больш. Трэба берагчы тое, што ёсць сёння ў нас. Што створана і завяавана бацькамі, дзядулямі і бабулямі», — параіў Ігар Сергеенка моладзі.

Кульмінацыяй мерапрыемства стала ўрачыстая цырымонія ўручэння пашпартоў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Апроч дакумента, юныя грамадзяне атрымалі Дзяржаўны сцяг, Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь і памятную паштоўку. Школьнікі, якія актыўна падтрымлівалі адкрыты дыялог, былі адзначаны спецыяльнымі падарункамі ад БРСМ.

Нават пасля афіцыйнага завяршэння мерапрыемства юныя грамадзяне падыходзілі да Ігара Сергеенкі і Аляксандра Лук'янава, каб задаць ім асабістыя пытанні.

Лізавета ГОЛАД.

Парламенцкі дзённік

Экзамен для ахоўнікаў і забарона нажывацца на крэдытах

Дэпутаты разгледзелі шэраг законапраектаў

Перш чым пачаць пасяджэнне дзявятай сесіі, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ўручыў пашпарты двум дзясяткам юных беларусаў з Віцебскай вобласці. Гэты ўрачысты рытуал, які ўжо стаў добрай традыцыяй, прымеркаваны да Дня Канстытуцыі і праводзіцца ў межах патрыятычнай акцыі «Мы — грамадзяне Беларусі!».

«Атрыманне пашпарта — знакавая і ўрачыстая падзея для кожнага чалавека, сур'ёзны жыццёвы этап, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка, звяртаючыся да хлопцаў і дзяўчат. — Нягледзячы на яшчэ юны ўзрост, вы ўжо сваімі справамі, учынкамі даказалі, што і ваша малая радзіма — Віцебшчына, і ў цэлым Рэспубліка Беларусь можа ганарыцца вашымі дасягненнямі, але галоўныя, асноўныя перамогі ў вас яшчэ наперадзе. Усё ў вашым далейшым жыцці залежыць менавіта ад вас. Самае галоўнае, каб вы заўсёды заставаліся сапраўднымі грамадзянамі і патрыётамі нашай краіны».

Дзеля большай мабільнасці гараджан

У першым чытанні дэпутацкім корпусам разгледжаны праект Закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб гарадскім электрычным транспарце і метрапалітэне». У прыватнасці, мяркуецца, што фізічныя асобы, якія знаходзяцца на станцыі метрапалітэна і маюць намер заключыць дагавор перавозкі пасажыра метрапалітэнам, па патрабаванні работнікаў метрапалітэна абавязваны будуць прадстаўляць ручную паклажу для надгляду. Улічваючы пашырэнне магчымасцяў аплаты праезду па сродках сістэм продажу білетаў, а таксама іншымі спосабамі, прадугледжваецца карэкціроўка тэрміна «электронны білет».

— Якасці транспартнага абслугоўвання насельніцтва ў нашай краіне ўдзяляецца належная ўвага, — падкрэсліў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Аляксандр ГРАНКОЎСКІ.** — Практыка прымянення Закона Рэспублікі Беларусь «Аб гарадскім электрычным транспарце і метрапалітэне» паказала, што закон мае патрэбу ў некаторых змяненнях і дапаўненнях. Закон падрыхтаваны з мэтай удасканалення прававога рэгулявання адносін па арганізацыі і выкананні пасажырскіх перавозак гарадскім электрычным транспартам і метрапалітэнам. Яго прыняцце будзе садзейнічаць забеспячэнню гарадской мабільнасці нашых грамадзян.

Кажучы аб эфектыўнасці работы Мінскага метрапалітэна, **міністр транспарту і камунікацый Аляксей АЎРАМЕНКА** заўважыў, што тарыфы на метро альбо гарадскі электрычны транспарт сёння нясуць сацыяльна значную нагрузку. «З пункту гледжання акупнасці паездкі гэта — 46 працэнтаў на сённяшні момант ад кошту затрат, — паведаміў ён. — Вядома, ва ўсім свеце (мы вывучалі тэму метрапалітэна) ён датуецца практычна ўсюды дзяржавай. Таму што на самаакупнасць вельмі складана выйсці пры тых затратах, якія нясе метрапалітэн, і той сацыяльнай функцыі, якую ён выконвае пры перавозцы пасажыраў, бо ў горадзе асноўны аб'ём перавозкі пасажыраў — гэта метрапалітэн».

Да ахоўнікаў — сур'ёзныя патрабаванні

Парламентарыі ў першым чытанні прынялі законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахоўнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь». Дакументам прадугледжваецца, у прыватнасці, надзяленне Савета міністраў паўнамоцтвам па вызначэнні правілаў правядзення асабістага надгляду, надгляду рэчаў і дакументаў, транспартных сродкаў супрацоўнікамі спецыяльнага органа аховы. Міністэрства ўнутраных спраў надзяляецца паўнамоцтвамі на ўстанаўленне парадку правядзення кваліфікацыйнага экзамену па пытаннях ажыццяўлення ахоўнай дзейнасці работнікаў ваенізаванай аховы арганізацый. Акрамя таго, органамі ўнутраных спраў будзе ажыццяўляцца праверка работнікаў ваенізаванай аховы на прыдатнасць да дзеянняў, звязаных з прымяненнем і выкарыстаннем зброі, спецыяльных сродкаў і фізічнай сілы і іншага.

Як паведаміў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ,** комплексная карэкціроўка закона выклікана тым, што апошні раз змяненні ў закон уносіліся ў 2017 годзе, а таксама ў сувязі з прыняццем шэрагу законаў і ўказаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, нормы якіх закранаюць дадзеную сферу дзейнасці. «Законапраектам прадугледжваецца прывядзенне нормаў закона ў адпаведнасць з Канстытуцыяй, а менавіта дапаўненне пераліку арганізацый, якія маюць права на ажыццяўленне ахоўнай дзейнасці, арганізацыямі, створанымі ва ўстаноўленым Прэзідэнтам парадку, — удакладніў кіраўнік міліцэйскага ведамства. — Такім чынам, узнікла неабходнасць у карэкціроўцы пераліку арганізацый, што маюць права на ажыццяўленне ахоўнай дзейнасці».

Нарматворчая дзейнасць — па-новаму

У другім чытанні адобраны законапраект «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах», які распрацаваны ў развіццё абноўленай Канстытуцыі. У прыватнасці, замацоўваецца статус Усебеларускага народнага сходу як суб'екта права заканадаўчай ініцыятывы, вызначаецца, што ў склад заканадаўства ўваходзяць рашэнні УНС.

— Актам заканадаўства будуць з'яўляцца рашэнні, якія датычацца зацвярджэння кірункаў унутранай і знешняй палітыкі, Ваеннай дактрыны, Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі, асноўных кірункаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, устанаўлення дзяржаўных свят і святочных дзён, — заўважыла **член Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Ірына ДАЎГАЛА.** — Акрамя таго, заканапраект прадугледжвае норму аб тым, што змяненні ў заканадаўчыя акты, як правіла, будуць уносіцца не часцей за адзін раз на два гады. Адна з навел датычыцца лічбавізацыі нарматворчай дзейнасці. Законапраект выключае норму прыняцця Прэзідэнтам дэкрэтаў — гэта таксама з'яўляецца выкананнем тых абнаўленняў, якія ёсць у Канстытуцыі. Вызначаны алгарытм, якім чынам дзеянне дэкрэта будзе або спыняцца, або прызнавацца страціўшым сілу.

Фінансавыя інструменты

Законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях банкаўскай дзейнасці», адобраны ў першым чытанні, прадугледжвае замацаванне ў Банкаўскім кодэксе мэты «забеспячэнне фінансавай стабільнасці», а таксама нормы аб садзейнічанні ўстойліваму эканамічнаму развіццю краіны. Як звярнуў увагу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Віталь ВАСЮКОЎ,** адно з палажэнняў Банкаўскага кодэкса будзе датычыцца абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг — фізічных асоб. «У прыватнасці, уводзіцца забарона на ўстанаўленне павышанай працэнтнай стаўкі па крэдытах у выпадку неналежнага выканання сваіх абавязацельстваў перад банкам, — удакладніў парламентарый. — Таксама ўводзяцца абмежаванні, што датычацца памераў пені, штрафаў, якія банкі могуць прымяняць у адносінах да нядобрасумленных крэдытаатрымальнікаў».

Парламентарыямі ратыфікавана Пагадненне аб заснаванні Еўразійскай перастраховачнай кампаніі. Як паведаміла **член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Святлана БАРТАШ,** рашэнне аб падпісанні Пагадненя аб заснаванні Еўразійскай перастраховачнай кампаніі прынята пяццю краінамі: Арменіяй, Беларуссю, Казахстанам, Кыргызстанам і Расіяй. «Стварэнне новага фінансавага інструмента выклікана часам: для таго каб сёння выключыць або мінімізаваць рызыкі пры экспартна-імпартным складніку ўсіх краін, ён і ствараецца, — адзначыла дэпутат. — У перыяд санкцыйнага ціску на нашы краіны, калі не выконваюцца раней заключаныя дагаворныя абавязацельствы, патрэбны быў гэты інструмент. Стварэнне еўразійскай перастраховачнай кампаніі будзе з'яўляцца гарантам. Аб'ём перастраховачнага фонду складзе прыкладна 2 мільярды долараў ЗША. І гэта будзе з'яўляцца гарантам паспяховай работы нашых прадпрыемстваў».

Акрамя таго, дэпутаты ратыфікавалі Пагадненне аб супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД па папяржданні і рэагаванні на надзвычайныя сітуацыі ў галіне грамадскай аховы здароўя санітарна-эпідэмічнага характару.

Вераніка КАНЮТА.

Родныя рэчы

КАРОТКАЯ ПЕРАДГІСТОРЫЯ

Праект, як вядома, мае на ўвазе імпартазамяшчэнне. Ідэя ўвогуле ляжала на паверхні, асабліва пасля сыходу з Беларусі еўрапейскіх брэндаў, якія былі запатрабаваныя спажыўцом і прапаноўвалі шырокі асартымент самага рознага прыгожага і якаснага хатняга начыння і наогул усяго, што аблягчае быт і «ў гаспадарцы спатрэбіцца». Летась, якраз вясной, дацкая сетка Jysk абвясціла аб намеры зачыніць свае крамы ў нашай краіне. Выстраіліся чэргі... Праўда, праз некаторы час крамы яшчэ раз адчынілі дзверы — для распродажу рэшткаў, але потым пра тавары сеткі Jysk (брэнд з 2016 года паспеў адкрыць у нашай краіне 10 крам: у сталіцы, а таксама ў Мінскім раёне, Брэсце і Гродна, Магілёве, Бабруйску, Маладзечна і Пінску) беларусам давялося забыцца на нявызначаны тэрмін. Следам пакінуў Беларусь і шведскі брэнд IKEA — уласна, увоз тавараў кампанія прыпыніла таксама вясной, а летам перасталі працаваць і анлайн-маркеты. Zara Home ў Беларусі засталася, і менавіта з ёй сёння трэба будзе канкураваць будучай сеткі «Да дому», першая ластаўка якой — канцэпт-стор у «Дана Моле».

Ідэя «Да дому» нарадзілася якраз мінулым летам (калі абнаўлялі беларускі павільён ВДНГ), як распавяла журналістам старшыня канцэрна «Беллегпрам» Таццяна Лугіна, анансуючы ў верасні 2022-га будучае адкрыццё крамы. Вывучыўшы пытанне, спецыялісты вырашылі, што вытворцаў якаснага і прыгожага хатняга начыння ў нас дастаткова. Тавару хапіла б і на 500 квадратных метраў гандлёвай плошчы, як задумвалася спачатку, але адзін з самых папулярных у сталіцы гандлёвых цэнтраў пакуль прапанаваў у якасці «пробнага шара» плошчу ў 250 м². Там і размясцілася 10 тысяч найменняў айчынных тавараў для дому ад дзясяткаў вытворцаў — ад буйных прадпрыемстваў (брэнды Blakit, Добрушскі фарфоравы завод, «Стужка», «Беларускі лён», «Віцебскія дываны», «Світанак», «Палессе», «Белмастацкераміка» і г. д.) да рамеснікаў.

ДА ДОМУ, ДА ХАТЫ

Фактычна «Да дому» ў «Дана Моле» — гэта не проста крама, а канцэпт-стор. Што гэта за «звер», растлумачым для тых, хто крыху не ў тэме. Аказваецца, канцэпт-стор — гэта не буцік, а своеасаблівая мультыбрэндавая «пячора Аладзіна», дзе ёсць усё: ад прадметаў інтэр'еру да адзення, тэкстылю, прыгожых дробязяў і дызайнерскіх рэчаў. Аб'ядноўвае ўсё гэта пэўная тэма, ідэя, атмасфера і дызайн. То-бок тавары падбіраюцца ў межах абранага погляду на стыль і ў цэлым на жыццё. Канцэпт-сторы, выходзячы з задумкі, павінны прадстаўляць пакупніку лімітаваныя лінейкі і ўнікальныя рэчы (дарэчы, некаторых прадстаўленых у «Да дому» тавараў няма ў фірменных крамах вытворцаў, іх можна купіць толькі тут).

Закладзеная ў аснову канцэпцыі крамы творчая ідэя адчуваецца адразу каля ўвахода ў гандлёвую прастору. Гэта модны цяпер мінімалісцкі стыль інтэр'еру плюс нацыянальны каларыт. Тут спадабаецца тым, каму блізкае вырашэнне інтэр'ераў з пазіцыі прысутнасці ў доме адкрытай прасторы і сонечнага святла. Лаканічнасць, спакой і прастата наогул гістарычна блізкія, як мне здаецца, разуменню прыгажосці і ўтульнасці беларусамі і ў гэтым яно (тое самае разуменне прыгажосці «па-нашаму») сугучнае актуальнаму сёння скандынаўскаму стылю. Нічога дзіўнага — такі стыль асабліва арганічны ў рэгіёнах, дзе звышдастаткова халодных пахмурных дзён, а ў нас — якраз такі клімат. Такім чынам, светлая і вольная прастора, прахалодныя тоны, а таксама натуральныя (шэры, белы, пастэльны блакітны, мятны, лавандавы, рыжовы, карычневыя і пясочныя адценні). На гэтым фоне можна расставіць яркія колеравыя акцэнты. Дызайн дапаўняюць утульны тэкстыль, простыя формы і стрыманы лаканічны дэкор плюс перавага натуральных матэрыялаў. Менавіта прыхільнікі такога разумення прыгажосці інтэр'еру застануцца задаволеныя, пабываўшы ў «Да дому». І, дарэчы, такое разуменне прыгажосці, як аказалася, блізкае мінскім пакупнікам. Нават у першай палове буднага дня ў краме дастаткова наведвальнікаў.

— У выхадныя вельмі шмат людзей цэлы дзень, — распавяла прадавец. — А адразу пасля адкрыцця кожны дзень быў як выхадны па колькасці наведвальнікаў і пакупнікоў.

Пакуль «Да дому» адзін, але ўжо відавочна, выходзячы са спажывецкай цікавасці, што такіх крам павінна стаць больш — напэўна, сетка будзе развівацца па Мінску і па ўсёй Беларусі, упэўненая дзяўчына.

РАЗГЛЕДЗІМ ДЭТАЛІ

Яшчэ адзін фактар, які выклікае прыхільнасць да новай крамы, — даступныя цэны. Многія пазіцыі — у разы танейшыя за імпартныя аналагі. З самых дарагіх — мабыць, пасцельная бялізна (ад 230—270 рублёў набор з натуральнага лёну), а лідзіруе кілім з натуральнай аўчыны (каля 700 рублёў). Але вось жакардавы дываначок экалагічных расфарбовак ад ААТ «Віцебскія дываны», напрыклад, абыдзецца ў залежнасці ад памеру ў 33—53 рублі. Здаецца, такіх цэн сёння ўжо не бывае.

— Дывайкі ў нас разлятаюцца як гарачыя піражкі, — распавяла прадавец.

Удакладнім: 33,73 — дываноk памеру 80х150, 53 рублі з капейкамі — дыван памерам большы. Такія кілімкі вельмі лёгка чысцяцца: і пыласосам, і проста венікам або шчоткай, таму іх часта купляюць у прыхожую. Некаторыя расфарбоўкі ўпішуцца і на кухню — у абедзенную зону.

Дарэчы, пра кухню. Надзвычай мілая кераміка з Радашковіч (ААТ «Белмастацкераміка») не б'е па кішэні: напрыклад, цукарніца — 19,60, а чайны кубачак — наогул 4 рублі 58 капеек. А яшчэ тут можна купіць тыя самыя гліняныя збанкі, у якіх так цудоўна гатаваць парцыённую смажаніну ў духоўцы. Каштуюць яны крыху больш за дзясятку. Збанкі з палівай апетытных, «смачных» карамельных колераў. Талерка дызайнерскай формы стане вашай за 8 рублёў, вазачка — за 18. Святочнае вялікае блюда будзе каштаваць крыху больш за дваццаць рублёў. Падсвечнік — 16. Сімпатычная талерка з хвалістымі бакамі — 8, але ёсць талеркі і наогул за 2 BYN. 8 рублёў каштуе і кубак. Ваза вышынёй крыху менш за 40 см абыдзецца ў 43 рублі. А ваза крыху меншая — Br18.

Тэкстыль — падстава для асобнай размовы. Парцьеру 250х270, лён напалову з бавоўнай ад Аршанскага льнокамбіната, у «Да дому» можна купіць за 73,20. Натуральны плед (125 на 200) — за 134,44, ёсць трохі таннейшыя і даражэйшыя. Расфарбоўкі і фактуры самыя розныя: вочы разбягаюцца і хочацца набыць адразу ўсё. Ёсць і ў пастэльных тонах, і тыя, што стануць каляровым акцэнтам. Набор пасцельнай бялізны (чысты лён) у залежнасці ад памераў — ад 250 да 370 рублёў. Затое льняны ручнік будзе каштаваць ад 8 да 9—10 рублёў. А сучасны аналаг класічнага беларускага ручніка (праўда, без вышыўкі) — ён чамусьці на этыкетцы названы «Дарожка дэкаратыўная» — абыдзецца ў 19,62. Калі любіце крэатывіць самі, тут жа можна купіць на аздабленне самыя розныя карункі — імітацыю даматканых. Выглядае выдатна. 14,40 маточак.

З тавараў, якія працуюць на нацыянальны каларыт, хочацца яшчэ адзначыць, напрыклад, розныя віды гарбаты з Белавежскай пушчы, а таксама букецікі сухіх раслін і духмяныя сашэ (шалфей, лаванда, чабор). За букецік прапануецца аддаць 7 рублёў, за сашэ (духмяны мяшочак, яго можна пакласці ў шафу, дзе захоўваецца бялізна, або пакінуць на паліцы з кнігамі) — 8 руб. Здаецца, крышачку шкада столькі за гэткую дробязь, але многія набываюць, расказалі прадаўцы.

Што яшчэ сказаць пра «Да дому»? Ёсць цэлы стэлаж з таварамі для лазні, калі хто любіць папарыцца — а любяць многія. У асартыменце нават венікі — бярозавы і эўкаліптавы (другі, зразумела, даражэйшы за першы). Ёсць хатняе адзенне (самы, напэўна, дарагі варыянт — трыкатаж ад ААТ «Палессе» — 218 руб. 76 кап.) і піжамы (напрыклад, ад ЗАТ «Калінка» — 124 рублі). Тэпцікі — 42,55. Ёсць патэльні, жароўні і рондалі з антыпрыгарным пакрыццём, цэны на гэтыя пазіцыі — не вышэй і не ніжэй ад чаканняў (невялікая патэльня ад ВПУП «Вікторыя» — 50,42, жароўня большага памеру — 85 з капейкамі).

Такім чынам, выснова: ці варта пабываць у «Да дому»? Адназначна варта. Застаецца толькі дадаць, што ў краме дзейнічаюць карткі растэрміноўкі — «Халва» і «Карта пакупак». І гэта таксама працуе ёй у плюс.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па сутнасці

Пра птушак, людзей і істот

У беларускай традыцыі да птушак адносяцца з павагай, па-чалавечы. Зімой сяляне падкормліваюць крылатых каля сваіх сядзіб, а гараджане з задавальненнем дзеляцца пачастункам з качанятамі альбо лебедзянятамі. Вядома, птушкі для беларусаў — сімвал жыцця. Гнёзды буслоў — сімвал хатняга дабрабыту і пладавітасці, жаваранкі нагадваюць пра надыход вясны, перамогу жыцця, а самотны крык гусей з-пад аблокаў увосень — пра непазбежнасць сыходу, пра сум па Радзіме. Затое ўвесну мы чакаем новага ўздыму жыццёвых сіл і разам з Саракамі сустракаем з выраю прашчураў, новы год неўміручасці.

Вось так беларусы і жылі спрадвеку. Гадавалі збажыну і дзяцей, будавалі свае гнёзды і сем'і. А захопнікі прыходзілі і руйнавалі нашы хаты, вынішчалі палеткі; нібы калоссе — людзей. Што, няпраўда? Так было заўжды. Мы ніколі не прыходзілі да суседзяў з захаду са зброяй — ніколі. А яны да нас — пастаянна. Кожныя паўстагоддзя. Што, няпраўда?

А цяпер увогуле так нахабна здзекуюцца з нас. Брыдка лгуць. Маўляў, гэта мы агрэсары і гэтак далей. Варшаўскія ўлады малююць карты з мяжой пад Мінскам. Агнём і мячом намагаюцца не толькі адкрыта, але ж — цішком. Агнём і мячом па сэрцах і галовах нашых людзей. Я не мог зразумець: як можна падтрымліваць тыя чорныя сілы, што з'яўляюцца нашчадкамі карнікаў? Тых, хто пад усмешкі заходніх «гуманістаў» забіваў нашых немаўлят, гвалціў нашых прыгажунь, паліў жанчын, дзяцей і старых. Жывымі. А мы здзіўляемся, як магла ў наш час здарыцца адэская трагедыя. Дык гэта тая ж «філасофія»! Чаму тут здзіўляцца? Здзіўляцца могуць толькі тыя беларусы, якія справай альбо думкамі падтрымліваюць украінскія ўлады. Улады, што загадалі замініраваць усю граніцу з Беларуссю, а самі тым часам распрацоўваюць супраць нашай краіны тэракты.

З тэрыторыі Украіны ўжо «прыляталі» ракеты, зброя, дапамога мясцовым радыкалам — нават баевікоў для вулічных сутычак рыхтавалі там. А мы ўсё даравалі — і заклікалі да міру. Не мір ім патрэбны, ім неабходная вайна. Рахунак таго ж Зяленскага расце, як некалі рос яго рэйтынг клоўна. А разам з тым растуць ва Украіне могілкі. Вось вам і ўсе кропкі над беларускім «і». І хто — агрэсар? Лукашэнка замежным журналістам расказваў, як скончыць канфлікт ва Украіне, а ў той час украінскія ўлады планавалі, як уцягнуць у гэты канфлікт Беларусь. Бо інтарэсы нават уласнага народа і дзяржавы іх не цікавяць. А для некаторых беларусаў «дэмакратычны Захад» — абсалют ісціны. Што здзіўляцца, былі і такія ў нашым народзе істоты. З белай павязкай і «шмайсерам» на плячах. Былі — і засталіся.

Намагаліся разам з дыверсантамі падрэзаць крылы — знішчыць ваенны самалёт. «Супраціў». Супраць каго вы? Супраць свайго народа. Таму і судзіць трэба, як некалі ворагаў народа. Мо словазлучэнне і з негатыўнай канатацыяй. Але трапна сказана. Бо адным прызнаннем некаторых не перавыхаваеш. Пустазелле з поля вырываюць. Інакш палеткі зарастуць і прападзе ўвесь ураджай.

Кажуць, пад нагамі трэба бачыць не лужыны, а зоркі. Калі выходзіць з гэтага, то негатыўны факт прынёс і шмат пазітыўнай інфармацыі. Па-першае, рэакцыя беларускіх сілавікоў. Напрыклад, пагранічнікі не прапусцілі таго дыверсанта. Прафайлінг, унутрунае адчуванне. Таго ж дбайнага афіцэра знайшлі, далі яму слова, і ўсе пераканаліся, наколькі з нашага боку граніца, што называецца, закрытая. Па-другое, уся аперацыя па затрымаці дыверсанта. Сёння кожны тэракт плануецца так, каб яшчэ «ўзарваць» медыйную прастору. Падарваць аўтарытэт таго ці іншага боку, нарабіць шораху ў грамадстве. На тое ж разлічвалі спецслужбы нядобразычлівых для нас краін. Не атрымалася. Медыйны парадак дня адпрацавалі вельмі трапна і кемна. Без эмоцый і гучных заяў. Магчымасць гучных заяў падаравалі нашы сілавікі. І КДБ, і МУС спрацавалі філігранна. Двойчы прыемна — міліцыя недалёка ад свайго прафесійнага свята, тройчы — што перад святам жанчын. Маўляў, ёсць каму абараніць. Затрыманне прайшло без лішніх слоў. Затое дыверсант шмат што распавёў. Тое, што ні ўлады, ні спецслужбы суседзяў нават не чырванелі — зразумела. Звычайная справа. Яны ж пад ручку з «заходняй дэмакратыяй».

Мне больш цікавыя тыя, хто з тутэйшых, якія былі пад ручку з ворагамі. Знешніх мы адолеем. У нашых людзях у форме я не сумняваюся. А вось што наконт унутранага ворага. Таго, што, нібыта змяя на майскім сонцы, затаіўся і чакае зручнага моманту — упіцца джалам у светлае цела Беларусі. Няўжо яшчэ не ўбачылі, не зразумелі, не ўцямілі, на якім баку сапраўднае свята? І хто заўжды гатовы падрэзаць крылы нашай роднай краіне. Праўда, нават спрабаваць рабіць тое нікому не раю. У беларускай ментальнасці да птушак сакральнае стаўленне. Не чапайце. Каб людзьмі звацца, а не істотамі.

Яўген ПУСТАВОЙ.

Шанхайскі расклад

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Завяршаецца работа па афармленні дыялогавага партнёрства з Бахрэйнам, Кувейтам, Мальдывамі, М'янмай і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі. У 2021-м быў пачаты працэс павышэння статусу Ірана ў складзе арганізацыі да ўзроўню дзяржавы-члена. Колькасць заявак ад розных краін на ўступленне ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва павялічваецца. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на спецпрадстаўніка прэзідэнта Расіі па справах ШАС, пасла па асобых даручэннях МЗС Бахціера Хакімава. Чым жа прывабліве ШАС?

АМБІЦЫЙНАЯ МЭТА

З 2010 года наша краіна з'яўляецца партнёрам па дыялогу, а з 2015-га мае статус афіцыйнага назіральніка ШАС. Рашэнне аб пачатку працэдуры прыёму Беларусі ў арганізацыю аднагалосна было прынята на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Самаркандзе ў верасні мінулага года. «Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва ператвараецца з рэгіянальнай арганізацыі ў глабальную. І самае галоўнае цяпер — не ўпусціць гэты момант. Трэба даць шанц тым дзяржавам (іх нямала) для таго, каб яны маглі знайсці альтэрнатыву існуючым рэаліям. Наша арганізацыя можа стаць глабальнай. Аб'ектыўна стаць. І вырашаць глабальныя праблемы светаўладкавання ў сучасных умовах. Трэба не спазніцца, злавіць гэты момант і адэкватна на гэта адказаць», — адзначыў у сваім выступленні на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Самаркандзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Летась на долю дзяржаў ШАС прыпадала амаль 70 працэнтаў усяго тавараабароту Рэспублікі Беларусь. Па словах міністра замежных спраў Сяргея Алейніка, такая лічба пацвярджае важнасць развіцця эканамічнага вымярэння ўзаемадзеяння нашай краіны з ШАС. «Мы бачым вялікія перспектывы, значны патэнцыял гэтага супрацоўніцтва і разлічваем актыўна ўдзельнічаць ва ўсіх вымярэннях», — адзначыў Сяргей Алейнік. Як заўважыў кіраўнік МЗС, многія ініцыятывы, якія вылучаліся Прэзідэнтам Беларусі, былі падтрыманы. У прыватнасці, правядзенне сумеснага саміту АДКБ і ШАС па сітуацыі ў Афганістане ў 2021 годзе. «Гэта добры прыклад таго, як беларускія ініцыятывы знаходзяць сваё адлюстраванне ў дзейнасці арганізацыі. Таму наша паўнапраўнае членства ў ШАС надасць імпульс не толькі нашаму ўзаемадзеянню ў цэлым, але і з дзяржавамі — членамі арганізацыі. З усімі мы падтрымліваем добрыя дружалюбныя адносіны, якія носяць партнёрскі і ў некаторых выпадках стратэгічны характар», — падкрэсліў міністр. Цяперашні статус Беларусі ў якасці назіральніка не дае магчымасці паўнацэнна ўдзельнічаць ва ўсіх фарматах арганізацыі. «Паўнапраўнае членства шырэй адчыніць для нас дзверы і дазволіць больш эфектыўна ўдзельнічаць ва ўсіх фарматах работы. І мы бачым у гэтым сур'ёзныя перпектывы не толькі для эканамічнага супрацоўніцтва, але і для палітыка-эканамічнага ўзаемадзеяння, — заўважыў Сяргей Алейнік. — Гэта важна, паколькі ШАС з'яўляецца адной з апор шматпалярнага свету. І вельмі важна быць уцягнутымі ў працэсы ўмацавання шматпалярнасці з пазіцыі Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва».

У лістападзе мінулага года беларускім бокам распрацаваны алгарытм па ўступленні ў ШАС у паскораным фармаце. 17 студзеня 2023 года на пасяджэнні Савета нацыянальных каардынатараў Арганізацыі падпісаны Пратакол па выніках кансультацый упаўнаважаных прадстаўнікоў дзяржаў — членаў ШАС з упаўнаважаным прадстаўніком Беларусі. Гэтым дакументам афіцыйна запушчана працэдура далучэння нашай краіны. 9 лютага 2023 года падпісаны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 31, якім адобраны праект Мемарандума аб абавязацельствах Беларусі ў мэтах атрымання статусу дзяржавы — члена ШАС.

Стратэгічнае пытанне Прэзідэнт Беларусі абмеркаваў падчас рабочай сустрэчы з Генеральным сакратаром Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Чжан Мінам. Гэта ўжо іх другая сустрэча. Беларускі лідар і генеральны сакратар ШАС сустракаліся ў верасні 2022 года напярэдадні саміту арганізацыі ў Самаркандзе. Прэзідэнт падзякаваў генеральнаму сакратару і сакратарыяту ШАС за работу, што праводзіцца ў адносінах да Беларусі, якую на мінулым саміце фактычна прынялі ў сям'ю Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. «Вы ведаеце нашу мэту. Для таго каб юрыдычна стаць паўнапраўным членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, у Беларусі павінны быць праведзены пэўныя юрыдычныя працэдуры. Мы павінны далучыцца да тых рашэнняў, якія былі прыняты раней Шанхайскай арганізацыяй супрацоўніцтва. Мы паставілі перад сабой амбіцыйную мэту — прайсці гэты шлях на працягу бягучага года да саміту ў Дэлі. Гэта хуткі тэмп, сур'ёзны тэмп, але калі вы нас падтрымаеце, гэта будзе добры досвед для іншых», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што будучы назіральнікам у ШАС, Беларусь сур'ёзна рыхтавалася да ўступлення ў Шанхайскую арганізацыю супрацоўніцтва. «Таму мы адназначна зможам па тэрмінах укласціся да чэрвеня, да того моманту, як у Дэлі мы зноў сустрэнемся, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Нашы мэты вы ведаеце, нашы магчымасці таксама вядомыя ўсім членам ШАС».

Генеральны сакратар Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва падкрэсліў, што пасля дзвюх сустрэч з Прэзідэнтам у яго склалася ўражанне, што беларускі бок аддае вялікую ўвагу далучэнню да ШАС і завяршэнню дадзенай працэдуры. «Беларускія намаганні ў гэтым напрамку заслужылі вялікую ўвагу з боку дзяржаў — членаў ШАС. Усе дзяржавы — члены арганізацыі пры каардынуючай ролі сакратарыята пачалі працаваць над пытаннем далучэння Беларусі. І за два месяцы было прынята рашэнне аб старце працэдуры далучэння. Па хуткасці прыняцця рашэння было беспрэцэдэнтна. Гэта сведчыць аб тым, што ўсе дзяржавы-члены вельмі цэняць, што беларускі бок падзяляе каштоўнасці і прынцыпы ШАС і на працягу многіх гадоў у якасці назіральніка адыгрываў важную ролю ў супрацоўніцтве ў рамках ШАС», — падкрэсліў Чжан Мін.

ВЕЛІЗАРНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

Аб прыярытэтах нашай краіны ў ШАС Прэзідэнт Беларусі грунтоўна распавёў у сваім выступленні на саміце Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва летась у верасні. «Прыярытэты Беларусі ў ШАС нязменныя — гэта эфектыўнае супрацоўніцтва з партнёрамі па ўмацаванні рэгіянальнай бяспекі, інтэнсіўным развіцці эканамічнага ўзаемадзеяння, паглыбленні гуманітарных сувязяў», — заявіў беларускі лідар.

Асобна Аляксандр Лукашэнка вылучыў шэраг напрамкаў супрацоўніцтва. На парадку дня — каардынацыя сумесных дзеянняў і выпрацоўка калектыўнага адказу на новыя выклікі і пагрозы ў эканоміцы. «Мы выступаем за развіццё ўзаемазвязанасці, стварэнне камбінаваных «зялёных» калідораў і далейшае ўкараненне сістэмы інтэграванага кіравання транспартнымі патокамі з выкарыстаннем лічбавых тэхналогій», — заявіў беларускі лідар.

Прэзідэнт выказаў перакананне, што надыходзіць спрыяльны час для ўжо стартаваўшых лагістычных і інфраструктурных праектаў, якія злучаюць Еўропу з Азіяй, уключаючы рэалізацыю ініцыятывы «Новы Еўразійскі сухапутны мост». За больш чым 20-гадовую гісторыю арганізацыяй многае зроблена па стварэнні спрыяльных умоў для развіцця гандлю і інвестыцый. «Беларусь бачыць велізарны патэнцыял ШАС у плане стымулявання гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, найбольш запатрабаваныя напрамкі такога супрацоўніцтва — прамысловая і тэхналагічная кааперацыя, лічбавая трансфармацыя і штучны інтэлект, «зялёная» эканоміка і кліматычная адаптацыя, а таксама ліквідацыя неабгрунтаваных гандлёвых бар'ераў. «Гэта дазволіць забяспечыць спалучэнне нацыянальных стратэгій і доўгатэрміновых планаў стабільнага і паскоранага развіцця», — заявіў Прэзідэнт.

«Беларусь зацікаўленая ў пашырэнні супрацоўніцтва ў сферы мірнага атама, а таксама ў галіне прымянення розных эканамічна эфектыўных і экалагічна чыстых тэхналогій», — дадаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што цяпер трэба пановаму паглядзець на стан супрацоўніцтва ў банкаўскай і фінансавай сферах. «Незаконныя санкцыі, адключэнне ад міжнародных разлікаў, іншыя нелегітымныя абмежаванні вядуць да неабходнасці збліжэння плацежных сістэм, павелічэння долі нацыянальных валют у гандлі, а таксама стварэння ўласных фінансавых механізмаў у рамках ШАС. Дадзены падыход дасць не толькі свабоду выбару, але і свабоду дзеянняў», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Беларусь традыцыйна моцная ў пытаннях харчовай бяспекі. Па шэрагу напрамкаў сферы АПК беларускімі аграрыямі дасягнуты вынікі сусветнага ўзроўню, а якасць айчыннай прадукцыі вядомая ва ўсіх краінах арганізацыі і не толькі. «Мы гатовыя актыўна падключыцца да сумеснай работы па забеспячэнні харчовай бяспекі нашай сям'і, сям'і ШАС, уключаючы супрацоўніцтва ў сферах разумнай сельскай гаспадаркі, аграінавацый, тэхналогій дакладнага земляробства і рэсурсазберагальных тэхналогій», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Мінск таксама выступае за пашырэнне міжнароднага ўзаемадзеяння і развіццё супрацоўніцтва ШАС з іншымі рэгіянальнымі структурамі, такімі як АДКБ, СНД, ЕАЭС. Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў канчатковым выніку гэта можа стварыць падмурак для далейшага ўмацавання Еўразійскага партнёрства на аснове канцэпцыі «інтэграцыя інтэграцый».

Беларусь надае важнае значэнне гуманітарнаму вымярэнню ШАС. Асаблівае месца тут займае ўзаемадзеянне па развіцці традыцыйнай і інавацыйнай медыцыны, у тым ліку тэлемедыцыны, вытворчасці лекавых сродкаў і медыцынскіх вырабаў, аб чым на саміце казаў і прэм'ер-міністр Індыі Нарэндра Модзі.

Асобна Аляксандр Лукашэнка сказаў аб спорце: «Спорт закліканы аб'ядноўваць краіны і народы. Сёння, на жаль, ён таксама актыўна палітызуецца Захадам». У мэтах павышэння аўтарытэту дзяржаў-членаў і канкурэнтаздольнасці спартсменаў на сусветных арэнах беларускі бок прапанаваў разгледзець магчымасці правядзення ў рамках ШАС комплексных міжнародных спаборніцтваў па летніх алімпійскіх відах спорту ў 2024 годзе і па зімовых — у 2026 годзе.

Беларусь гатовая канструктыўна супрацоўнічаць па пытаннях процідзеяння тэрарызму, сепаратызму, экстрэмізму, незаконнаму абароту наркотыкаў, зброі, ядзерных і радыеактыўных матэрыялаў, арганізаваній злачыннасці і нелегальній міграцыі, адзначыў Прэзідэнт. Ён таксама заявіў аб падтрымцы стварэння ўніверсальнага цэнтра па пагрозах і выкліках бяспецы ШАС на базе рэгіянальнай антытэрарыстычнай структуры ў Ташкенце.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўзаемадзеянне і збліжэнне Беларусі з ШАС непарыўна звязанае з фарміраваннем архітэктуры бяспекі і супрацоўніцтва ўсяго Еўразійскага кантынента. «Дзякуючы свайму палітычнаму ўплыву, эканамічнай сіле і ўнутранай трывалаасці наша арганізацыя цалкам саспела для таго, каб больш актыўна і настойліва спрыяць выбудоўванню міжнароднай палітыкі на прынцыпах непадзельнай бяспекі і разнастайнасці шляхоў прагрэсіўнага развіцця», — адзначыў Прэзідэнт.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

З 2010 года наша краіна з'яўляецца партнёрам па дыялогу, а з 2015-га мае статус афіцыйнага назіральніка ШАС. Рашэнне аб пачатку працэдуры прыёму Беларусі ў арганізацыю аднагалосна было прынята на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Самаркандзе ў верасні мінулага года. «Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва ператвараецца з рэгіянальнай арганізацыі ў глабальную. І самае галоўнае цяпер — не ўпусціць гэты момант. Трэба даць шанц тым дзяржавам (іх нямала) для таго, каб яны маглі знайсці альтэрнатыву існуючым рэаліям. Наша арганізацыя можа стаць глабальнай. Аб'ектыўна стаць. І вырашаць глабальныя праблемы светаўладкавання ў сучасных умовах. Трэба не спазніцца, злавіць гэты момант і адэкватна на гэта адказаць», — адзначыў у сваім выступленні на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС у Самаркандзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
16 САКАВІКА 2023 г.
ЧАЦВЕР
№ 5 (15949)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Уладзімір АРУЦЮНЯН:

«Для мяне галоўнае — застацца чалавекам»

Ён стаў героем для многіх аматараў вакальнага шоу «Фактар.by», калі прайшоў на ім шлях ад кастынгу да суперфіналу. Мяняў вобразы, здзіўляў рэпертуарам, вакалам і з выпуску ў выпуск працягваў змагацца за шанц заявіць пра сябе на вялікую аўдыторыю... А як змянілася жыццё маладога чалавека пасля праекта, на што ён гатовы дзеля поспеху і ў чым бачыць уласныя перспектывы, мы распыталі ў артыста пры сустрэчы.

— Уладзімір, на «Фактар.by» ў вас з'явілася шмат прыхільнікаў, і іх інтарэс не праходзіць дагэтуль. Скажыце, у якой ступені гатовы пускаць людзей у сваю асабістую прастору?

— Асабістае жыццё — гэта толькі маё, бо я ведаю, што ёсць мяжа ў тым, што я гатовы паведаміць публіцы. Заўсёды з задавальненнем дзялюся нейкімі фактамі пра сябе, магу расказаць пра ўласны вопыт як чалавека і артыста, але ў прынцыпе адкрываюся людзям толькі ў той меры, якую лічу для сябе прымальнай.

— А сяброў у вас шмат? Што ўвогуле значыць для вас сяброўства?

— У мяне іх трынаццаць. Як у фільме «13 сяброў Оўшэна» *(Смяецца.)* У нас менавіта мужчынскае сяброўства. У маім разуменні дружба — гэта калі табе цікава і ёсць пра што пагаварыць з чалавекам, і вы абодва гатовыя прыйсці на дапамогу абсалютна бескарысліва. Не мае значэння, клічаш ты сябра штурхаць машыну ў мароз позняй вечарам альбо ён дапамагае табе як прафесіянал у нейкім пытанні. Сапраўдны сябар заўсёды з табой і на тваім баку проста таму, што вы блізкія па духу. Менавіта ў гэтым для мяне заключаецца самая вялікая каштоўнасць сяброўства.

— Думаю, прыхільніцам цікава, якую дзяўчыну вы ўяўляеце побач з сабой?

— Я разумею, што прафесія артыста — гэта пастаянныя раз'езды, знаёмствы і сустрэчы са шматлікімі людзьмі, і прыняць такі стыль жыцця не заўсёды проста. Таму мне хочацца спаткаць клапатлівую, добрую дзяўчыну, якая здолее зразумець мяне, маю прафесію і падтрымае на абраным шляху.

— На праекце «Фактар.by» што было для вас найбольш складаным выпрабаваннем?

— У прынцыпе ўсё шоу можна разглядаць як выпрабаванне, дзе ты праяўляеш сябе ў самых розных сітуацыях. Ты можаш не паесці, не высыпацца, але найбольш перажываеш за вынік плюс разумееш, што гэта работа ў прамым эфіры. А паралельна людзі часам пішуць табе недарэчныя, крыўдныя каментарыі — усе ўдзельнікі такія паведамленні атрымлівалі. Таму ўвесь час на праекце — адзін вялікі экзамен, але я яго ўспрымаў як магчымасць мне вырасці над сабой.

— А ў той перыяд, калі вам давялося развітацца з перспектывай спартыўнай кар'еры і пераключыцца на музыку, што дапамагло прыняць сітуацыю?

— Разуменне, што гэта ўжо незваротны крок. Але пэўны час усё яшчэ працягваў заставацца ў спорце. Я чатыры гады займаўся бодзібілдынгам, у чым таксама дасягнуў добрых вынікаў. І менавіта тое, што нават са зменай прафесійных інтарэсаў працягваў хадзіць на трэніроўкі, мне і дапамагло паступова перастроіцца на новую хвалю.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Крэатыўная прастора

ГЕАГРАФІЯ Ў ЖАНРЫ ФЭНТЭЗІ І «БЕЛАРУСКІ ПРАВАНС»

Што яшчэ прадставілі фіналісты праекта «100 ідэй для Беларусі»

«Сучасны рамонт дарог павінен быць максімальна хуткім, а для гэтага патрабуюцца тэхналагічна простыя і даступныя ў выкарыстанні матэрыялы. Пры гэтым не варта забываць, што мы павінны ствараць камфортныя ўмовы не толькі для сябе, але і для навакольнага асяроддзя. Толькі ў яднанні з прыродай чалавек будзе па-сапраўднаму шчаслівы». Гэта філасофія маладой каманды даследчыкаў-інаватараў DAKPatch, якая прадставіла свой праект у гранд-фінале рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі».

«Хуткая дапамога» для дарогі

У дванаццатым сезоне конкурсу яго арганізатары, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі сумесна з Міністэрствам адукацыі, Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях і Нацыянальнай акадэміяй навук, атрымалі каля 1200 заявак. Аўтарам 129 праектаў было прапанавана прадставіць сваю распрацоўку ў гранд-фінале. У іх лік трапілі і **студэнты БНТУ Ягор ЖУКОЎСКІ і Аляксей КАРОНЧЫК.** Пра сябе хлопцы кажуць: «Мы паставілі перад сабой задачу — зрабіць гэты свет крышачку лепшым, а дакладней, зрабіць нашы дарогі больш камфортнымі». Яны прапанавалі інавацыйныя матэрыялы, прызначаныя для рамонту калдобін на дарожным пакрыцці невялікіх памераў (плошчай да 0,5 квадратнага метра), — DAKPatch UNO, для рамонту калдобін любых памераў (DAKPatch Vito) і для герметызацыі расколін на асфальтабетонных пакрыццях (DAKPatch QRA).

Фота Facebook ГОПАД

Ягор Жукоўскі і Аляксей Карончык з праектам «DAKPatch — матэрыялы для рамонту дарог».

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Пункт адліку

СВОЙ КОД ІДЭНТЫЧНАСЦІ

Усебеларуская акцыя «Мы — грамадзяне Беларусі!», прысвечаная Дню Канстытуцыі, стартавала 13 сакавіка мерапрыемствам у Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь.

Фота БелТА.

У рамках акцыі напярэдадні і ў Дзень Канстытуцыі 14-гадовым беларусам па ўсёй краіне ва ўрачыстай абстаноўцы ўручалі галоўны дакумент — пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Гэтая патрыятычная ініцыятыва, прапанаваная БРСМ у 2004 годзе, набыла шырокую папулярнасць сярод моладзі і па праве лічыцца адной з важных традыцый краіны. Урачыстае ўручэнне нацыянальных пашпартоў падлеткам падкрэслівае іх пераход у дарослае жыццё, дае магчымасць яшчэ лепш усвядоміць, што цяпер яны сталі паўнапраўнымі грамадзянамі Беларусі, адказнымі перад ёй і яе законамі.

З 13 да 15 сакавіка мерапрыемствы патрыятычнай акцыі прайшлі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Толькі па лініі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі сёлета адбылося каля 150 уручэнняў з удзелам больш як 3100 чалавек. Сімвалічна, што першае мерапрыемства стартавала ў Канстытуцыйным Судзе.

Галоўнымі героямі ўрачыстасці сталі па тры прадстаўнікі ад кожнай вобласці і Мінска — усяго 21 чалавек. Дзеці атрымалі пашпарты з рук Старшыні Канстытуцыйнага Суда, заслужанага юрыста Беларусі Пятра Міклашэвіча і першага сакратара ЦК БРСМ Аляксандра Лук'янава.

Дзяржаўнае свята Дзень Канстытуцыі Беларусі штогод адзначаецца 15 сакавіка. Асноўны Закон вызначае асновы дзяржаўнай улады і грамадскага жыцця, гарантуе асноўныя правы і свабоды грамадзян, вызначае асновы дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы, а таксама з'яўляецца важным фактарам для фарміравання грамадзянскай ідэнтычнасці і нацыянальнай самабытнасці беларусаў.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

ГЕАГРАФІЯ Ў ЖАНРЫ ФЭНТЭЗІ І «БЕЛАРУСКІ ПРАВАНС»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Нашы кампазітныя матэрыялы маюць шэраг пераваг, — расказваюць Ягор і Аляксей. — Перад выкарыстаннем іх не трэба падагравaць ці перамешваць (дастаткова проста раўнамерна размеркаваць сумесь па ўсёй плошчы), іх можна класці ў ваду і не ачышчаць папярэдне калдобіну ад бруду. Яны прызначаны для рамонту дарог у неспрыяльных умовах надвор'я: у зімовы час, вясной, падчас дажджу, калі трэба хутка ліквідаваць дэфекты ў дарожным пакрыцці і павысіць бяспеку дарожнага руху. Да таго ж і часу для «хуткай дапамогі» дарозе трэба няшмат. Папярэдняе ўшчыльненне матэрыялу адбываецца пад уздзеяннем уласнай вагі рабочага, а даўшчыльненне — падчас руху транспарту. Нашы матэрыялы складаюцца з адходаў нафтапераpрацоўчай і горназдабыўной вытворчасці. Яны могуць служыць не менш як тры месяцы да моманту, калі надвор'е дазволіць зрабіць паўнавартасны рамонт дарогі. Гэта значыць, што зімой мы прымяняем танны і хуткі матэрыял, а летам яго замяняем. Рамонт з такімі матэрыяламі не патрабуе складаных спецыяльных навыкаў і абсталявання. Яны могуць распаўсюджвацца як у індывідуальнай тары праз гандлёвыя ўстановы, так і аптовымі партыямі.

Фота Лізаветы ГОЛАД

Цэнтр дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна прадставіў праект «Лялька.бай». Знаёмцеся: Весялінка, Сплюша і дзед Баюн.

Па словах хлопцаў, цяпер ідзе апрабацыя іх матэрыялаў на тэрыторыі Мінска. Ужо былі пробныя рамонты на вуліцах Навуковая, Платонава, Пляханава і іншых.

У намінацыі «Грамадства і сацыяльная сфера» свой праект «Тэкстыльны развіццёвы дыванок» прадставіла **малады майстар вытворчага навучання Мінскага дзяржаўнага каледжа індустрыі моды Таццяна ЦІШКАВЕЦ,** якая пачала ўвасабляць сваю ідэю ў жыццё, яшчэ будучы навучэнкай каледжа. Дыванок прызначаны для дзяцей дашкольнага ўзросту. Яго прымяненне на занятках спрыяе псіхафізічнаму развіццю дзіцяці, развіццю ў яго маторыкі, увагі, памяці, логікі, фантазіі, а таксама нівеліруе адставанне ў развіцці дзяцей малодшага ўзросту.

Дыванок складаецца з розных модуляў: яны ўзаемазамяняльныя, іх можна кампанаваць у залежнасці ад патрэб заказчыка. Працуючы над увасабленнем ідэі, яе аўтар звярталася па дапамогу псіхолага: спецыяліст тлумачыў, што патрабуецца, напрыклад, для развіцця ў дзіцяці маторыкі, а што — для памяці.

У адукацыйнай практыцы дыванок ужо апрабавалі на малышах у цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і ў дзіцячых садках. Немалаважна, што для дыванка выкарыстоўваюцца тэкстыльныя адходы — у каледжы індустрыі моды іх заўсёды хапае. Тэхналогія праектавання і пашыву прадукцыі максімальна набліжана да дробнасерыйнай вытворчасці, яе можна прымяняць не толькі для індывідуальнага пашыву, але і ва ўмовах невялікіх вытворчасцяў. Дарэчы, у дзяўчынкі ўжо ёсць прыватны заказ з Расіі. Яе дыванкі набылі адзін з мінскіх дзіцячых садкоў і цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання. Каго ідэя зацікавіла, могуць звяртацца ў Мінскі дзяржаўны каледж індустрыі моды. Яго прадстаўнікі паабяцалі выканаць усе заказы.

З мовай пазнаёміць Ясь

Міністр адукацыі Андрэй Іванец, які наведаў экспазіцыю фіналістаў конкурсу, з задавальненнем адзначыў, што ў гэтым годзе было шмат прадстаўлена інавацыйных праектаў у адукацыйнай сферы, а намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка заўважыў, што шмат праектаў прэзентавалі менавіта школьнікі з самых розных рэгіёнаў, многія з якіх прайшлі навучанне ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку.

Адзін з такіх праектаў — навучальна-гульнявы інтэрактыўны комплекс «Ясь». Тры ў адным. Яго стварылі **дзесяцікласнікі мінскай сярэдняй школы № 111 Ілья ВАЛЫНЕЦ і Максім АТРАХІМОВІЧ** пад кіраўніцтвам настаўніка беларускай мовы і літаратуры Мікалая Курыловіча.

— Чаму тры ў адным? Таму што комплекс складаецца з трох інтэрактыўных элементаў: гэта лінгвістычны сайт «Ясь», галасавы памочнік «Ясь», а таксама настольная гульня з элементамі робататэхнікі, — расказваюць хлопцы. — Галоўная мэта праекта — папулярызацыя беларускай мовы ў грамадстве, развіццё моўных і маўленчых кампетэнцый. Аб'яднаць родную мову з інфармацыйнымі тэхналогіямі — гэта значыць зрабіць яе прывабнай для сучаснай моладзі.

Матэрыялы сайта будуць карыснымі для вучняў школ, гімназій, навучэнцаў каледжаў, студэнтаў ВНУ, якія вывучаюць прафесійную лексіку, і проста для аматараў беларускай мовы. Галасавы памочнік «Ясь» уяўляе сабой бібліятэку аўдыязапісаў: уводзіш пэўны запыт і слухаеш лінгвістычны матэрыял на прыгожай і меладычнай беларускай мове. Асабліва карысным ён будзе для вучняў з парушэннямі зроку.

А гульня «Ясь» уяўляе сабой поле, разбітае па вертыкалі на дзве паловы. На кожнай знаходзіцца па дзесяць «станцый» з асобнымі пытаннямі і заданнямі. Пры правільным адказе робат Ясь пачынае «ўсміхацца», дзеці дакранаюцца да інтэрактыўнай фішкі, і яна пераязджае на наступную станцыю. У адваротным выпадку Ясь «сумуе», гульцы не чапаюць інтэрактыўную фішку, застаюцца на гэтай жа станцыі і наступны раз выконваюць тое ж заданне. Перамагае тая каманда, якая прыйдзе да фінішу першай.

Фэнтэзійную інтэрактыўную навелу «Захавальнік стыхій» (geoigra.tilda.ws) прадставіў у гранд-фінале **дзесяцікласнік Ёдкаўскай сярэдняй школы Лідскага раёна Ілья ГУЛЬНІК,** які прапанаваў паглыбіцца ў загадкавы свет стыхій. Падзеі разгортваюцца ў выдуманым свеце, дзе магія і цуды — звычайная з'ява. Калісьці даўно тут жылі чатыры асобныя нацыі: Паветраныя качэўнікі, Племя Вады, Царства Зямлі і Народ Агню. І вось Народ Агню распачаў жорсткую вайну супраць усіх. Сусвету патрабуецца герой, які можа кіраваць чатырма стыхіямі. Толькі ён можа вярнуць баланс і аднавіць мір і гармонію на Зямлі. Перамагчы зло можна, сабраўшы разам чатыры элементы стыхій і дабавіўшы да іх загадкавы пяты. Гэта кароткі пераказ сюжэтнай лініі захапляльнай гульні, прысвечанай вывучэнню... геаграфіі. Пытанні і заданні падабраныя згодна з праграмай курса за шосты клас. Гульню Ілья ствараў пад кіраўніцтвам маці — Наталлі Юр'еўны Гульнік, якая выкладае ў школе геаграфію. Дарэчы, гэты інфармацыйны рэсурс быў адобраны Міністэрствам адукацыі і можа выкарыстоўвацца ў навучальным працэсе.

Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ

Ілья ГУЛЬНІК і Наталля ГУЛЬНІК з фэнтэзійнай інтэрактыўнай навелай «Захавальнік стыхій».

Васільковыя палеткі і ядомы каштан

Але не толькі інфармацыйнымі тэхналогіямі захапляюцца беларускія школьнікі. Так, **адзінаццікласнікі сярэдняй школы № 8 Крычава Іван КРАЎЧАНКА і Ягор ЧАРКАСАЎ** прапанавалі бізнес-ідэю «Беларускі Праванс». Юныя наватары вырашылі спалучыць экалагічны, турыстычны і аграрны складнікі. Палеткі, што не выкарыстоўваюцца пад сельскагаспадарчыя культуры, яны прапануюць засяваць васільком, чаборам і лавандай. Улетку маляўнічыя мястэчкі стануць арыгінальнай турыстычнай лакацыяй для адпачынку, а таксама эфектнай фотазонай. А пасля заканчэння цвіцення з вырашчанай прадукцыі можна рабіць пасцілу, духмяныя дабаўкі да гарбаты і кавы, прыправы, васільковую соль, сіропы, варэнне. Таксама можна рабіць і прадаваць букецікі з кветак. Каб распачаць бізнес, дастаткова нават невялікага кавалачка зямлі. Гэта плюс іх бізнес-ідэі. А мінус — кароткі тэрмін цвіцення раслін (усяго трычатыры тыдні) і неспрыяльныя ўмовы надвор'я, якія могуць унесці свае карэкціроўкі.

Навучэнцы Маладзечанскага гандлёва-эканамічнага каледжа Уладзіслава ГАРДЗЕЙ і Дар'я ЗЯНОВІЧ замахнуліся, у сваю чаргу, на вырошчванне і рэалізацыю ядомага каштана. Гэта асаблівы сорт, яго не сустрэнеш на вуліцах нашых гарадоў. На трэці год жыццёвага цыкла дрэва будзе даваць пладоў ужо ад 10 да 50 кілаграмаў. Вось адзін з магчымых рэцэптаў далікатэсу: каштаны замочваюцца, затым на іх робяць надрэзы і змяшчаюць у духоўку пры тэмпературы 150 градусаў на гадзіну-дзве. Каштаны гатуюцца абсалютна без алею. Можна дабавіць соль і цукар. Атрымліваецца безглютэнавы прадукт, пазбаўлены харчовых алергенаў, вельмі карысны тым, хто сочыць за здароўем, і тым, каму прадукты з утрыманнем глютэну супрацьпаказаныя. Да таго ж лісце такога каштана выкарыстоўваецца ў сыраварстве, кара — у медыцыне для вытворчасці дубільных экстрактаў і ў якасці фарбавальніка, а драўніна — для вытворчасці бочак для дарагіх сартоў віна, а таксама для мэблі.

Выдатны падарунак для дзіцяці

«Хлопчыкі і дзяўчынкі, я Весялінка. Вельмі люблю спяваць песні, а яшчэ шмат ведаю пра наш горад Глыбокае. Пра яго людзі кажуць — музей пад адкрытым небам...» Адначасова простую і геніяльную ідэю прапанавалі навучэнцы аб'яднанняў па інтарэсах Цэнтра дзяцей і моладзі Глыбоцкага раёна («Чароўны пэндзлік» і ўзорны тэатр моды «Аліса»), якія прадставілі праект «Лялька.бай». Усіх, хто наведаў іх стэнд, яны знаёмілі са сваімі лялькамі. Першая — Сплюша, спявае дзеткам нанач калыханкі, другая — Весялінка, спявае вясёлыя песенькі, а дзед Баюн распавядае малышам казкі. Разынка ў тым, што лялькі спяваюць і размаўляюць на беларускай мове. Гэта вельмі падабаецца дзецям.

— Усе нашы лялькі — аўтарскія, ручной работы, у кожную ўкладзена душа, — расказвае **кіраўнік узорнага тэатра моды «Аліса» Аксана ШПАКАВА.** — Іх можна рабіць на заказ. Музычны эфект забяспечваецца за кошт партатыўнай гукавой калонкі, якая знаходзіцца ўнутры выробу, і флэшкі-назапашвальніка (на шэсць гігабайт) з пэўным наборам музычнага і мастацкага матэрыялу. Ёсць таксама магчымасць трансляцыі па bluetooth-канале мабільнай прылады. Гэта значыць, што матуля можа займацца сваімі справамі на кухні і «кіраваць» разумнай цацкай.

Чым цікавыя нашы лялькі? Набываючы іх, у бацькоў з'яўляецца вольная хвілінка для адпачынку ці сваіх спраў. Іх дзеці ў гэты час знаёмяцца з беларускім народным фальклорам — казкамі, песнямі, калыханкамі. Дарэчы, змест мастацкага матэрыялу на флэшцы можна самастойна змяняць і абнаўляць. Дзеці з маленства чуюць родную мову, вучацца яе паважаць і цаніць. У іх развіваюцца музычны слых і творчыя здольнасці. Гульня з такімі лялькамі прывівае любоў да роднага краю, яго традыцый і абрадаў. Ляльку можна выкарыстоўваць у дашкольнай установе як развіццёвую цацку. Мы лічым, што нашы лялькі — выдатны падарунак на любое свята. Прыгожая аўтэнтычная лялька, якая спявае і размаўляе на роднай мове, стане добрым сябрам для дзяцей.

Пры жаданні кожная матуля і тата, бабуля і дзядуля змогуць са сваімі дзецьмі вырабіць такія лялькі, выкарыстоўваючы рэкамендацыі нашай групы «УКантакце» «Лялька.Бай!». А ўсім ахвотным мы гатовы пашыць лялькі і забяспечыць іх патрэбным электронным «начынам»...

Трэба дадаць, што праект «Лялька.бай» быў прадстаўлены ў экспазіцыі фіналістаў і пераможцаў праекта «100 ідэй для Беларусі» розных гадоў. Стала ўжо традыцыяй асобна прадстаўляць увасобленыя ідэі. Дарэчы, кожны пяты праект за ўвесь перыяд правядзення конкурсу быў рэалізаваны на практыцы ці ў вытворчасці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Лакацыі актыўнасці

«СТАРТ» ДЛЯ ЮНЫХ ЖУРНАЛІСТАЎ

Рэспубліканскі конкурс пад такой назвай праходзіць у БДУ. Творчае спаборніцтва прымеркавана да Года міру і стваральнай працы. Яго мэта — папулярызацыя прафесіі сярод таленавітых дзяцей. Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца навучэнцы школ, ліцэяў, гімназій і каледжаў, члены аб'яднанняў юных журналістаў ва ўзросце да 18 гадоў.

У рамках творчага спаборніцтва прадугледжаны чатыры намінацыі з агульнай тэмай «Год міру і стваральнай працы». У катэгорыі «Публікацыі» прымаюцца матэрыялы аб'ёмам не больш за тры старонкі. Яны павінны быць заверaны галоўным рэдактарам выдання. У намінацыі «Відэаблогі» ад кожнага канкурсанта ўдзельнічаюць два відэаролікі працягласцю да пяці хвілін, апублікаваныя на відэахостынгу YouTube. У «Аўдыяпадкастах» трэба прадставіць два запісы хронаметражом не больш за тры хвіліны. Яны павінны быць размешчаны на інтэрнэт-платформе SoundCloud. Апошняя намінацыя прадугледжвае ацэньванне не больш як пяці фатаграфій без лічбавай апрацоўкі. Фотаработы неабходна прадставіць у друкаваным і лічбавым выглядзе ў фармаце JPG. Удзельнічаць можна індывідуальна ці калектыўна.

Работы прымаюцца да 30 красавіка па загадзя дасланай заяўцы на электронную пошту: moiseeva@bsu.by — і адрасе: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9 (факультэт журналістыкі БДУ).

Фінал творчага спаборніцтва і ўзнагароджанне аўтараў найлепшых работ адбудзецца 13 мая ў БДУ. Пераможцам уручаць дыпломы і памятныя падарункі.

Арганізатарам конкурсу выступае факультэт журналістыкі БДУ пры ўдзеле Міністэрстваў інфармацыі і адукацыі, Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, Беларускага саюза журналістаў і ва ўзаемадзеянні з рэспубліканскімі і рэгіянальнымі СМІ.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Камертон настрою

ВЫБІРАЦЬ, ДЫК КАРАЛЕВУ!

Міжнародны фінал конкурсу «Каралева студэнцтва» трыумфальна вяртаецца ў Беларусь. Гэтаму доўгачаканаму моманту садзейнічала леташняя перамога ў конкурсе Вікторыі Вараб'ёвай — студэнткі Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта.

Фота з сайта БРСМ.

Фінал XXXI Міжнароднага конкурсу прыгажосці і таленту «Каралева студэнцтва — 2022» адбудзецца ў Мінску 23 сакавіка на базе спартыўна-культурнага цэнтра Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Гэта абсалютна новая і нестандартная пляцоўка адкрывае для арганізатараў і рэжысёрска-пастановачнай групы дадатковыя магчымасці і дазволіць прыўнесці ў фінальнае шоу яшчэ больш цікавінак і навацый.

Папярэдні раз канкурсанткі сустракаліся на міжнародным фінале ў Мінску ў 2018 годзе пад брэндам «Каралева Вясна», пасля чаго фіналістак двойчы сустракаў расійскі Стаўрапаль. Быў апрабаваны і анлайн-фармат.

За тытул «Каралева студэнцтва — 2022» у творчых і інтэлектуальных спаборніцтвах будуць змагацца дванаццаць пераможцаў нацыянальных этапаў праекта — па шэсць ад Беларусі і Расіі.

Нашу краіну прадставяць фіналісткі рэспубліканскага конкурсу прыгажосці і таленту «Каралева студэнцтва Беларусі — 2022».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Віртуальная прастора

ДАКРАНУЦЦА ДА ГІСТОРЫІ Ў... INSTAGRAM

Хроніка БДУ прадстаўлена на тэматычнай старонцы ў папулярнай сацыяльнай сетцы. Гэта ініцыятыва належыць Музею гісторыі БДУ і прымеркавана да Года міру і стваральнай працы. У Instagram размяшчаюцца пасты з рэдкімі фатаграфіямі, фактамі аб малавядомых падзеях, асобах і самой ВНУ.

Ідэя праекта заключаецца ў пераемнасці пакаленняў. Студэнты, выкладчыкі, выпускнікі могуць пагартаць старонкі гісторыі Белдзяржуніверсітэта, згадаць сваіх педагогаў і ўніверсітэцкае жыццё.

Сёння ключавой задачай музея з'яўляецца захаванне гісторыі развіцця БДУ, карпаратыўных універсітэцкіх традыцый і рытуалаў. Супрацоўнікі музея шукаюць інфармацыю аб работніках і выпускніках універсітэта, алічбоўваюць гістарычныя матэрыялы. «Размяшчэнне ў Instagram нашай гістарычнай спадчыны, спадзяёмся, дазволіць дакрануцца ўсім, каго цікавіць Белдзяржуніверсітэт, да невядомага, захаваць на доўгія стагоддзі наш архіў і, магчыма, адкрыць універсітэт для тых, хто пра яго мала што ведае», — падкрэслівае загадчыца музея Эма Маліноўская.

Музей гісторыі БДУ пачаў сваю дзейнасць у 1924 годзе. Сёння ў адкрытай экспазіцыі прадстаўлена каля 1000 экспанатаў. Усяго фонд складае больш за 7000 архіўных аб'ектаў: гэта фатаграфіі, дакументы, прадметы побыту і асабістыя рэчы студэнтаў і выкладчыкаў, якія адлюстроўваюць падзеі розных гістарычных эпох. Сярод унікальных прадметаў — службовае пасведчанне першага рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты, студэнцкія білеты навучэнцаў, сярод якіх білет народнага пісьменніка Івана Мележа, пастанова аб адкрыцці ўніверсітэта ад 25.02.1919, фота даваеннага ўніверсітэцкага дворыка і інш.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Крок да прафесіі

Пра рэдакцыю — са школьнай лаўкі

У перыяд вясенніх канікулаў навучэнцаў школ, ліцэяў, гімназій, каледжаў і прадстаўнікоў аб'яднанняў юных журналістаў краіны запрашаюць наведаць факультэт журналістыкі БДУ. Тут хлопцаў і дзяўчат чакаюць экскурсія ў медыятэку, майстар-класы па медыяадукаванасці і сустрэча з беларускімі журналістамі.

Удзельнікам акцыі «Канікулы на журфаку» таксама прапануюць прайсці навучанне ў творчай майстэрні «Друкаванае выданне» па напрамках: «Фатаграфія», «Крытэрыі сучаснага журналісцкага тэксту: даступнасць, прывабнасць, папулярнасць», «Вёрстка і дызайн друкаванага выдання». Гасцям раскажуць аб спецыфіцы работы сучаснай рэдакцыі, навучаць прыёмам стварэння і рэдагавання журналісцкіх матэрыялаў, пазнаёмяць з асновамі камп'ютарнай вёрсткі і іншымі справамі.

Для ўдзелу ў акцыі неабходна да 27 сакавіка накіраваць заяўку на электронны адрас: sayanava@bsu.by. У лісце важна пазначыць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, установу адукацыі, электронны адрас і кантактны тэлефон. Таксама трэба вызначыцца з профілем майстэрні, паведаміць час наведвання факультэта і неабходнасць аб адзнацы ў пасведчанні аб камандзіроўцы ў тое, хто суправаджае школьнікаў з рэгіёнаў. Ім можа быць адзін з бацькоў ці прадстаўнік установы адукацыі. Для настаўнікаў прадугледжаны майстар-клас па медыяадукаванасці сучаснага педагога.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Даніна пашаны

«ХАТЫНЬ ВАЧЫМА ДЗЯЦЕЙ»

Напярэдадні 80-годдзя хатынскай трагедыі БРСМ запрасіў дзяцей і моладзь узяць удзел у патрыятычным конкурсе малюнкаў пад такой назвай.

Фота БРСМ.

Хлопцам і дзяўчатам прапаноўвалася прадставіць у трыятарыяльныя камітэты Саюза моладзі малюнкі на тэму трагедыі ў Хатыні, выкананыя ў любой тэхніцы: графіка, гравюра, жывапіс, калаж, вітраж і інш.

Конкурсныя работы прымаліся ў раённых камітэтах БРСМ, затым — у абласных (Мінскім гарадскім) і будуць ацэньвацца журы ў трох узроставых катэгорыях: 7—11 гадоў, 12—15 гадоў і 16—18 гадоў. Найлепшыя з іх прымуць удзел у рэспубліканскай выставе ў Мінску.

Трагедыя Хатыні — не выпадковы эпізод вайны, а адзін з тысяч фактаў, якія сведчаць аб мэтанакіраванай палітыцы генацыду гітлераўскай Германіі ў адносінах да мірнага насельніцтва Беларусі.

22 сакавіка 1943 года стаў апошнім для 149 хатынцаў, з іх 75 дзяцей да 16 гадоў. У полымі зніклі 26 дамоў. На месцы лясной вёскі засталіся папялішча і сіратлівыя пячныя коміны.

Створаны ў 1969 годзе на 54-м кіламетры шашэйнай магістралі «Мінск — Віцебск» на месцы спаленай вёскі Хатынь сімвал смутку і трагедыі генацыду беларускага народа — Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь» — уключаны ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У ліку найлепшых

З ДОСВЕДУ ПРАЦЫ ПІЯНЕРВАЖАТЫХ

Падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу піянерскіх распрацовак «Лічбавая трансфармацыя». Пераможцы і прызёры творчага спаборніцтва стануць удзельнікамі V Рэспубліканскага форуму важатых, які пройдзе ў верасні. Пра гэта расказалі ў Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі.

Конкурс праводзіўся з верасня 2022 года да лютага сёлетняга. Яго мэтай было стымуляванне сацыяльнай актыўнасці арганізатараў піянерскага руху Беларусі, акумуляцыя лепшага вопыту работы Беларускай рэспубліканскай арганізацыі. Педагогі, якія актыўна ўдзельнічаюць у жыцці піянерскай арганізацыі сваёй школы, дзяліліся распрацоўкамі для дзяцей і падлеткаў, каб максімальна ахапіць выхаваўчай дзейнасцю падрастаючае пакаленне. Гэта былі і анлайн-квэсты на веданне гісторыі краіны, і квізы на веданне піянерыі і яе традыцый, і інтэрактыўныя карты падарожжаў па радзіме, і многае іншае. Найлепшыя інфармацыйна-метадычныя распрацоўкі былі прадстаўлены на суд кампетэнтнага журы. Яны ўяўлялі сабой матэрыялы з досведу працы піянерважатых з актывістамі Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі праз інтэрнэт. Усяго ў конкурсе прынялі ўдзел больш за 600 педагогаў з усёй краіны. У фінал былі адабраныя 68 метадычных распрацовак.

У выніку ў намінацыі «Найлепшая распрацоўка анлайн-квэсту» першага месца ўдастоены праект «Рысяня Вогнік супраць тхара Злюкса. Аперацыя Новы год» педагога-арганізатара Бярозаўскай пачатковай школы Марыі Сівяковай. У намінацыі «Найлепшыя прыёмы гейміфікацыі ў сацыяльных сетках» таксама адзначана яе распрацоўка — прыёмы гейміфікацыі ДАА «Вясёлка» імя І. В. Тышкевіча ў сацыяльнай сетцы Instagram.

У намінацыі «Найлепшая распрацоўка анлайн-праекта» перамог анлайн-праект «Вогнік Тайм» педагога-арганізатара аддзела культурнай дзейнасці і вольнага часу Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Маяк» Мінска Аляксандры Вайценкі. У намінацыі «Найлепшая распрацоўка тэматычнага анлайн-квіза (віктарыны, брэйн-рынга і інш.)» першага месца ўдастоены тэматычны сайт «Піянерскі інтэлект — БУМ!» педагога-арганізатара гімназіі № 1 Барысава Марыі Саладар.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПЛЕЯДА МАЛАДЫХ

Станіслаў ЮРЭЦКІ:

«ШАНЦ УЗНАЧАЛІЦЬ НАВУКОВУЮ ЎСТАНОВУ — ГЭТА ВЫКЛІК САМОМУ САБЕ»

Старшыня Савета маладых вучоных НАН Беларусі — пра мэтанакіраванасць і жаданне рэалізавацца ў навуцы

ЁСЦЬ меркаванне, што рухаць навуку наперад павінна моладзь. У маладых заўсёды шмат ідэй, яны не баяцца праяўляць ініцыятыву, для іх не існуе бясспрэчных аўтарытэтаў, яны ўсё падвяргаюць сумненню і, галоўнае, не баяцца выходзіць за рамкі звыклых уяўленняў і рызыкаваць. Іх шчырае жаданне даследаваць, ствараць і адкрываць яшчэ «не сапсаванае» асяроддзем. На жаль, але паступова гэта жаданне знікае. Рызыкаваць хочацца ўсё менш... А для навукі патрэбныя менавіта смеласць і дзёрзкасць. Але ці часта можна пачуць ад маладых пра іх жаданне стаць даследчыкам? Пытанні падрыхтоўкі інтэлектуальнай эліты актуальныя для ўсіх краін. І Беларусь — не выключэнне. Аб прывабнасці прафесіі вучонага для беларускай моладзі і сістэме падтрымкі маладых талентаў у Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі мы гутарым са старшынёй Савета маладых вучоных Акадэміі навук, дырэктарам Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі, кандыдатам гістарычных навук Станіславам ЮРЭЦКІМ.

АД ПЕРШЫХ РАСКОПАК — ДА КАНДЫДАЦКАЙ

— Станіслаў Сцяпанавіч, раскажыце, як узнікла захапленне гісторыяй? Хто паўплываў на ваш прафесійны выбар: школа, педагогі ці, можа, бацькі?

— У маёй сям'і вучоных да мяне не было. Маці па прафесіі — інжынер, а бацька працаваў на рабочых спецыяльнасцях. Але ў нас дома заўсёды была вельмі добрая бібліятэка, усе любілі чытаць, была павага да кнігі, да школы і педагогаў таксама. Зацікавіўся гісторыяй я даволі рана. У другім класе запісаўся ў дзіцячую бібліятэку, дзе пастаянна браў гістарычную літаратуру. Я заканчваў у Маладзечне сярэднюю школу № 14. І мне вельмі пашанцавала з настаўнікам гісторыі. Валяр'ян Яўгенавіч Гайдуль і цяпер працуе ў гэтай навучальнай установе. У многім дзякуючы асобе свайго настаўніка я і здзейсніў свой прафесійны выбар. Да таго ж у школьныя гады ўдзельнічаў у алімпіядах па гісторыі, у тым ліку і на рэспубліканскім узроўні. Гэта дало мне магчымасць пазнаёміцца з хлопцамі і дзяўчатамі, якія захапляліся гісторыяй таксама як і я. Таму, калі прыйшоў час вызначацца ў старшых класах з прафесіяй і месцам навучання, я абраў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

— Калі паступалі ў БДУ, вы бачылі сябе ў школе педагогам (у вашай працоўнай біяграфіі ёсць і такі факт) ці ўсё ж такі адразу былі нацэлены на навуку?

— Я ведаў, што на гістфаку рыхтуюць у тым ліку і настаўнікаў, але адразу для сябе вырашыў: буду вучоным! Адметнасць гістарычнага факультэта БДУ ў тым, што там даюць вельмі добрую класічную адукацыю і пасля навучання можна рэалізоўваць сябе ў самых розных сферах. Я абраў навуку. Але ў школе таксама паспеў папрацаваць паралельна з навучаннем у магістратуры, пакуль не паступіў у аспірантуру. У мяне была поўная стаўка плюс класнае кіраўніцтва. Зусім не шкадую, што давялося акунуцца на пэўны час у педагагічную работу. Гэта была выдатная школа жыцця і вельмі карысны досвед. Работа з дзецьмі і іх бацькамі, што ні кажы, «загартоўвае» (*усміхаецца*. — **Аўт.**). Ад маёй працы ў школе засталіся толькі добрыя ўспаміны, тым больш што я працаваў у той жа школе, дзе вучыўся сам. Усё там было мне блізкае і зразумелае, пастаянна адчуваў падтрымку з боку больш вопытных калег. А цяпер я выкладаю на гістфаку, таму педагагічны досвед аказаўся запатрабаваны.

— Чым запомнілася навучанне ва ўніверсітэце і аспірантуры Інстытута гісторыі НАН Беларусі? Вам даводзілася ўдзельнічаць у археалагічных раскопках? Падзяліцеся найбольш яркімі момантамі...

— У раскопках я браў удзел, пачынаючы з першага курса гістфака, штогод. Канешне, найбольш запамінаюцца першыя раскопкі. Гэта быў 2008 год. Мы працавалі на стаянцы эпохі палеаліту пад Гроднам, у Кавальцах. І мае першыя археалагічныя знаходкі былі зроблены менавіта там. Гэта быў крэмневы адшчэп — загатоўка прылады для працы чалавека каменнага веку. На першых сваіх раскопках я зразумеў, што хачу быць не проста гісторыкам, а гісторыкам-археолагам, там жа сустрэў і будучага навуковага кіраўніка маёй кандыдацкай дысертацыі Вадзіма Леанідавіча Лакізу. Вельмі моцныя эмоцыі перажыў у 2021 годзе, калі знайшоў грунтовы могільнік эпохі Вялікага Княства Літоўскага. Я вельмі хацеў знайсці помнік, звязаны менавіта з гэтым перыядам — позняй Старажытнай Русі і пачаткам ВКЛ. Мы разам з мясцовымі школьнікамі вялі раскопкі ў Дзятлаўскім раёне. І за тыдзень работ нічога істотнага не знайшлі. У апошні дзень я падумаў: а ці не з'ездзіць на гарадзішча Санюкі? Многія археолагі даследавалі гэтыя мясціны, але значнага выніку не было. А мы заклалі пробныя шурфы і, нарэшце, знайшлі могільнік. Вось быццам бы хтосьці зверху мяне падштурхнуў гэта зрабіць у тым самым месцы.

— Вы абаранілі сваю кандыдацкую дысертацыю ў 28 гадоў. Якой тэме яна была прысвечана? Старшыня ВАК лічыць 28—30 гадоў аптымальным узростам для абароны кандыдацкай дысертацыі. Але на сёння сярэдні ўзрост абароны кандыдацкіх дысертацый набліжаецца ў краіне да 38 гадоў. На вашу думку, чаму так адбываецца?

— Тэма маёй кандыдацкай была прысвечана кераміцы эпохі неаліту Беларускага Панямоння. Па выніках вывучэння старажытнай керамікі выдзяляюцца археалагічныя культуры гэтага перыяду. Яе вывучэнне дае магчымасць зразумець тыя працэсы, што адбываліся на гэтых тэрыторыях у познім перыядзе каменнага веку пры пераходзе ў бронзавы век: гэта прыпяцка-нёманская культура і нёманская культура. Можна зразумець аспекты ўплыву супольнасцяў, якія мігрыравалі з тэрыторыі Заходняй і Цэнтральнай Еўропы — гэта культура шарападобных амфар і культура шнуравой керамікі. Вывучэнне керамікі вельмі важнае менавіта для старажытных часоў, калі яшчэ не было пісьменства, не захавалася ніякіх пісьменных помнікаў. І мы фарміруем свае ўяўленні пра тыя часы выключна па прадметах, якія знаходзім. Прызнаюся, што я заўсёды цікавіўся сярэднявеччам, а кандыдацкую дысертацыю абараніў па эпосе неаліту. Гэта было абумоўлена тым асяроддзем, у якое трапіў яшчэ на першых раскопках, і колам людзей, з якімі кантактаваў.

Я згодны з тым, што трэба імкнуцца абараніць кандыдацкую да 30 гадоў. Напісанне кандыдацкай работы не азначае, што ты зробіш адкрыццё, якое пераўзыдзе ўсіх тваіх папярэднікаў. Кандыдацкая дысертацыя — фактычна кваліфікацыйная работа, якая паказвае, што ты можам працаваць з навуковым матэрыялам, ведаеш методыку навуковага даследавання і можаш атрымаць новыя веды. А сама абарона вельмі важная ў плане таго, як ты трымаешся, як адказваеш на пытанні, ці можаш аргументавана адстойваць свой пункт погляду ў акадэмічным асяроддзі.

Канешне, абараніць кандыдацкую можна і ў 50, і ў 60 гадоў, аднак у 30 гадоў ты яшчэ малады вучоны, поўны сіл, можаш стварыць навуковы калектыў, развіваць пэўны кірунак у навуцы. Ёсць прыклады, праўда, іх не так шмат, калі маладыя даследчыкі абараняюць кандыдацкую яшчэ ў год заканчэння аспірантуры або крыху пазней. Гэта складана, але магчыма, калі канцэнтравацца толькі на навуцы.

САМЫ КАРОТКІ ШЛЯХ ДА САМАРЭАЛІЗАЦЫІ

— Летась Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў быў пераўтвораны ва Універсітэт НАН Беларусі. Ужо сёння выпускнікі ВНУ вызначаюцца з далейшымі жыццём і кар'ернымі планамі. Вы можаце прывесці аргументы на карысць навучання менавіта ў акадэмічным універсітэце? Чым ён прыцягальны для моладзі?

— Навучанне ва Універсітэце НАН Беларусі адбываецца толькі на ўзроўні магістратуры, а таксама ў акадэмічнай аспірантуры і дактарантуры. Там фактычна рыхтуецца інтэлектуальная эліта. Для гэтых мэт задзейнічана матэрыяльна-тэхнічная база ўсіх арганізацый Акадэміі навук, якая з'яўляецца найбуйнейшай навукова-тэхнічнай карпарацыяй у краіне. Фарміраванне будучых вучоных адбываецца не толькі ў вучэбных аўдыторыях, але і на перадавой акадэмічнай навукі: у лабараторыях акадэмічных інстытутаў і навукова-практычных цэнтраў, на эксперыментальных пляцоўках, падчас вытворчай практыкі. Магістранты адразу паглыбляюцца ў акадэмічнае навуковае асяроддзе, дзе генерыруюцца і ствараюцца новыя веды і інавацыйныя прадукты. Фактычна паралельна з адукацыйнай праграмай рэалізоўваецца і навуковая. З моладдзю, якая навучаецца ў акадэмічнай магістратуры і аспірантуры, працуюць вядучыя вучоныя, акадэмікі і дактары навук. Таму ў наш акадэмічны ўніверсітэт ёсць сэнс ісці тым, хто першапачаткова хоча звязаць сваё жыццё з навукова-даследчай або навукова-інавацыйнай дзейнасцю. Паступленне ва Універсітэт НАН Беларусі — самы кароткі і аптымальны шлях да навукі. Важна, што ў акадэмічныя арганізацыі пасля заканчэння нашай магістратуры ідзе працаваць большасць яе выпускнікоў.

— А што чакае маладога вучонага, які папоўніць шэрагі даследчыкаў акадэміі? Якія перад ім адкрываюцца прафесійныя і кар'ерныя перспектывы?

— Галоўнае — у яго з'яўляецца шанц заняць сваё месца ў навукова-даследчай карпарацыі. Насамрэч у Акадэміі навук створаны ўсе ўмовы для самарэалізацыі сябе ў навуцы. У нас праводзіцца вялікая колькасць мерапрыемстваў для маладых вучоных, створана цэласная сістэма падтрымкі маладых навукоўцаў, якая ўключае ў тым ліку магчымасці атрымання стыпендый і грантаў. Сёння практычна кожны трэці даследчык у Акадэміі навук — вучоны ва ўзросце да 35 гадоў. Калі магістрант ці аспірант прыходзіць у НАН Беларусі, ён можа ўдзельнічаць у рэспубліканскіх і акадэмічных конкурсах, напрыклад, на прэмію ў гонар славутых акадэмікаў Васіля Купрэвіча, Жарэса Алфёрава і Усевалада Ігнатоўскага.

У 2018 годзе быў заснаваны конкурс «100 маладых талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Удзельнічаць у ім могуць маладыя вучоныя, якія абаранілі кандыдацкую дысертацыю ва ўзросце да 30 гадоў або атрымалі навуковую ступень доктара навук ва ўзросце да 40 гадоў. Яны павінны мець вопыт кіраўніцтва навуковымі праектамі, працаваць з магістрантамі, аспірантамі, ствараць маладзёжныя каманды. Пагадзіцеся, што гэта дастаткова строгія крытэрыі, якім трэба адпавядаць, таму колькасць маладых талентаў, уключаных у банк па выніках года, не можа быць вялікай. У 2022 годзе іх было трое.

Лаўрэаты конкурсу атрымліваюць штогадовы грант на ўдзел у міжнародным навуковым, навукова-арганізацыйным або навукова-практычным мерапрыемстве, штогадовую прэмію ў памеры да сямі базавых ставак у перыяд уваходжання ў банк даных і ўключаюцца ў рэзерв кіруючых кадраў НАН Беларусі. Заўважу, што за апошні час пераможцы гэтага конкурсу істотна прасунуліся ў сваёй навуковай і адміністрацыйнай кар'еры. Многія з іх ужо займаюць кіраўніцкія пасады ў навуковых арганізацыях і лабараторыях. Я, дарэчы, у 2020 годзе таксама быў лаўрэатам гэтага конкурсу, а сёння ўзначальваю Цэнтральную навуковую бібліятэку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Дырэктар Інстытута эканомікі НАН Беларусі Дзяніс Муха, старэйшы за мяне на некалькі гадоў, таксама быў лаўрэатам конкурсу «100 маладых талентаў».

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ — ЛЮБІМАЯ СПРАВА

— Станіслаў Сцяпанавіч, прызнайцеся, калі вам, гісторыку, прапанавалі ўзначаліць Цэнтральную навуковую бібліятэку НАН Беларусі, ці доўга думалі? Усё ж такі гэта крыху іншы кірунак дзейнасці плюс адказнасць... Што для вас у новай рабоце самае складанае і самае цікавае?

— Пагадзіўся адразу, увогуле не раздумваў. Калі казаць пра адказнасць, то я ўжо працаваў намеснікам дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі, шчыра кажучы, мне адказнасці і там хапала. А шанц узначаліць навуковую ўстанову — выклік самому сабе. Тут ты можаш рэалізоўвацца не толькі як вучоны, але і як арганізатар навукі. Калектыў (130 чалавек) пераважна жаночы, таму, канешне, нюансы ёсць, але ўсё вырашальна.

Самае галоўнае — у нашай установы вельмі моцны навуковы складнік, тут праводзяцца гістарычныя даследаванні, і я ні разу не пашкадаваў пра здзейснены выбар. Нават тэрытарыяльна знаходжуся зусім недалёка ад Інстытута гісторыі, таму з пераносам рэчаў праблем не было (*смяецца*. — **Аўт.**). Мы, гуманітарыі, — адна вялікая сям'я ў Акадэміі навук. Таму не адчуваю асаблівых перамен і па-ранейшаму займаюся тым, што мне цікава. Канешне, колькасць задач павялічылася. Але цяпер я сам кіраўнік і мне прасцей планаваць свой працоўны дзень.

Сёлета ў бібліятэцы быў створаны Цэнтр даследаванняў старадрукаваных выданняў і рукапісаў, які ўзначаліў малады вучоны. Задача гэтай новай структуры — узмацненне менавіта даследчай работы. У нашых найбліжэйшых планах — стварэнне музейнай экспазіцыі навуковай кнігі, пачынаючы ад сярэднявечча і да сучаснасці.

Вельмі цікавай працай займаецца Цэнтр энцыклапедычных выданняў, створаны па ініцыятыве старшыні Прэзідыума НАН Беларусі Уладзіміра Рыгоравіча Гусакова. Поле дзейнасці цэнтра — стварэнне электроннай «Беларускай энцыклапедыі». Гэта наш адказ папулярнай электроннай «Вікіпедыі», якая ўтрымлівае шмат супярэчлівай і неправеранай інфармацыі. Гістарычныя факты там могуць падавацца па-рознаму, нават калі пераходзіш з адной мовы на іншую. Але не кожны школьнік ці студэнт крытычна падыходзіць да адбору інфармацыі.

Цяпер дапрацоўваецца сайт «Беларуская энцыклапедыя» (belarusenc.by). Па сутнасці, яго змест будзе ўяўляць сабой лічбавую шматтомную нацыянальную краіназнаўчую энцыклапедыю міжнароднага ўзроўню. Электронная энцыклапедыя заклікана акумуляваць усебаковую, кароткая і даступна выкладзеную інфармацыю аб мінулым і сучаснасці Беларусі, яе прыродзе, рэсурсах, эканоміцы, навуцы, культуры і сацыяльнай сферы. У энцыклапедыю будуць уключацца толькі сістэматызаваныя навукова выверaныя веды.

А самае складанае для мяне (не толькі на новай рабоце, а ўвогуле) — дэфіцыт часу. Я проста фізічна адчуваю, як час «бяжыць у пясок». Хочацца хоць некалькі лішніх гадзін у сутках. Разумею, што трэба правільна размяркоўваць свой час, не толькі працаваць, але і даваць мозгу адпачыць і перазагрузіцца. І сям'і, а ў мяне падрастае чатырохгадовы сын, таксама трэба ўдзяліць увагу. Маё шчасце ў тым, што жонка — таксама гісторык, працуе ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, таму сфера інтарэсаў у нас аднолькавая. І з яе боку ёсць і разуменне, і цярпенне. А найлепшы адпачынак для мяне — прыехаць у суботу на работу, калі там нікога няма, заварыць гарбату і засяродзіцца на напісанні артыкула. Яшчэ раней любіў ездзіць у метро, бо там можна было пачытаць кнігу...

— Станіслаў Сцяпанавіч, што б вы параілі маладым людзям, якія яшчэ вагаюцца, куды ім падацца: у навуку, на вытворчасць ці ў бізнес? Што для вас навука: работа, хобі, лад жыцця, магчымасць для самарэалізацыі ці што-небудзь іншае?...

— Усё, што вы пералічылі вышэй: і работа, і хобі, і лад жыцця, і магчымасць самарэалізацыі. Я ўжо казаў, што найлепшы адпачынак для мяне — займацца навукай, калі маю ўвагу нішто не адцягвае: ніхто не заходзіць у кабінет, не звоніць тэлефон. Мяркую, што маладым людзям трэба прыслухацца да сябе. Далёка не кожны чалавек можа пахваліцца тым, што займаецца любімай справай, а я магу. І калі давядзецца выбіраць паміж больш высокааплатнай справай і любімым заняткам, то трэба ўсё ж такі выбіраць тое, што бліжэй да душы. Шчыра кажу, што я ніколі не думаў, колькі буду атрымліваць. Нават пры пераходзе з адной работы на іншую не пытаўся пра свой заробак, таму што для мяне на першым месцы была магчымасць займацца любімай справай. У навуцы ёсць магчымасць годна зарабляць, нават будучы маладым вучоным. Ёсць перспектыўныя навуковыя праекты, работа па гаспадарчых дагаворах. Дзейнічае добра прадуманая сістэма фінансавай падтрымкі маладых вучоных. Аднак навукай трэба жыць паўсюдна — проста прасядзець ад званка да званка тут не атрымаецца. Навука не церпіць мітусні. Гэта напружаная штодзённая інтэлектуальная праца. Навука — такая цікавая сфера, дзе нават адмоўны вынік не лічыцца памылкай, а заўсёды можа стаць падмуркам для чагосьці зусім новага. Ва ўсе часы вучоных аб'ядноўвае адно жаданне — зазірнуць за гарызонт і атрымаць новыя факты, зафіксаваць новыя з'явы, каб потым выкарыстаць атрыманыя веды ў рэальным жыцці.

— Прызнайцеся, а ці ўваходзіць у вашы асабістыя планы абарона доктарскай?

— Такія планы ёсць, але я яшчэ ў самым пачатку іх здзяйснення. Ужо пачаў збіраць матэрыялы, праводзіць палявыя раскопкі, звязаныя з перыядам, які мяне заўсёды цікавіў, — Старажытная Русь і Вялікае Княства Літоўскае. І хоць мая кандыдацкая дысертацыя была прысвечана больш старажытным часам, я ні пра што не шкадую, таму што ў археолагаў самай складанай лічыцца першабытная археалогія. У тыя часы не існавала пісьменства, і ты спрабуеш праз свой мозг прапусціць, пра што могуць сведчыць знойдзеныя артэфакты, скласці нейкую карціну. Але цяпер я падышоў ужо менавіта да таго, каб прысвяціць свае пошукі Сярэднявеччу.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Поўны тэкст — на сайце zviazda.by.

Аўдыёверсія праекта — на радыё Пілот-FM і на сайце zviazda.by.

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

«Многоэтажный жилой дом со встроенными помещениями общественного назначения № 43 по генплану и многоуровневой автостоянкой на 300 машино-мест № 39 по генплану по ул. Р. Люксембург» (2-я очередь строительства)

Информация о застройщике

Наименование: совместное научно-производственное общество с ограниченной ответственностью «АРЭСА-СЕРВИС» (СООО «АРЭСА-СЕРВИС»)

Данные о госрегистрации: зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь 2 декабря 2002 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100154752.

Юридический (почтовый) адрес: 220113, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Логойский тракт, дом 15, корпус 4, кабинет 501.

Режим работы по вопросам долевого строительства: Пн. – Пт. 9.00 – 13.00; 13.45 – 17.45.

Информация о проекте строительства

Цель строительства объекта: строительство объекта «Многоэтажный жилой дом со встроенными помещениями общественного назначения № 43 по генплану и многоуровневой автостоянкой на 300 машино-мест № 39 по генплану по ул. Р. Люксембург» (2-я очередь строительства) в г. Минске.

Сведения о местонахождении объекта и его характеристики: «Многоэтажный жилой дом со встроенными помещениями общественного назначения № 43 по генплану и многоуровневой автостоянкой на 300 машино-мест № 39 по генплану по ул. Р. Люксембург» в г. Минске.

Вторая очередь строительства – многоуровневая автостоянка № 39 по генплану на 300 машино-мест. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас, перекрытия монолитные железобетонные.

Наружная отделка – фасады окрашиваются акриловой краской.

Полы – тротуарная плитка.

Количество машино-мест – 300 машино-мест.

Встроенные помещения административного назначения: не имеются.

Благоустройство территории: тротуары и дорожки предусмотрены из мелкоразмерной бетонной плитки.

Сроки реализации строительства второй очереди: начало строительства – апрель 2022;

завершение строительства – октябрь 2023.

Количество предлагаемых для заключения договоров объектов долевого строительства: 224 машино-места.

Вышеуказанные машино-места предлагаются по цене за 1 кв. м 480 долларов США.

Оплата производится в белорусских рублях по курсу НБ РБ на день оплаты.

У застройщика действует система регулирования стоимости объекта долевого строительства в зависимости от этажа (отметки), на котором размещено машино-место, условий оплаты объекта долевого строительства, а также иных, предусмотренных системой регулирования стоимости объекта долевого строительства, условий.

Данные о правах застройщика на земельный участок:

- решение Мингорисполкома от 24 марта 2022 года № 759 «Об изъятии и предоставлении земельных участков, разрешении строительства»;

- заключение РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА» от 21.02.2020 № 831-15/19; дополнения к заключению РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА» от 13.05.2020 № 246-15/20; дополнения к заключению РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА» от 10.08.2020 № 392-15/20;

- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка с кадастровым номером № 500000000005034312 и возникновения права на него от 26.04.2022 № 500/1804-5899;

- извещение Инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску о получении уведомления и регистрации объекта строительства от 12.04.2022 № 06/96.

Сведения о составе общего имущества многоуровневой автостоянкой на 300 машино-мест, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию: помещение электрощитовой, помещение охраны, технические помещения, помещение для размещения товарищества собственников для жилого дома по ул. Розы Люксембург, д. 181 и для размещения многоуровневой автостоянки № 39 по генплану на 300 машино-мест (2-я очередь строительства), помещения инженерного назначения, лестницы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоуровневой автостоянкой. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего имущества совместного домовладения определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации и передается застройщиком по акту приема-передачи представителю товарищества собственников либо лицу, уполномоченному общим собранием дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком: договор строительного подряда с СМ ЗАО «АРЕСА-СЕРВИС-СТРОЙ» от 11.04.2022 № 01/04.

Прием и регистрация заявлений на заключение договоров создания объекта долевого строительства осуществляется в порядке живой очереди по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Логойский тракт, д. 15, корпус 4, кабинет 507.

Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил в письменной форме об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и СООО «АРЭСА-СЕРВИС» вправе заключить договор с другим претендентом.

Сведения о порядке ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом осуществления работ по его строительству можно будет в офисе СООО «АРЭСА-СЕРВИС» по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Логойский тракт, д. 15, корпус 4, кабинет 507; тел.: 8 (017) 269-31-00; +37529 110 68 68, режим работы по вопросам долевого строительства: Пн. – Пт. 9.00 – 13.00; 13.45 – 17.45.

Сайты СООО «АРЭСА-СЕРВИС»: www.garmonia-dom.by, aresa-service.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Типография «Победа» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания производственного участка** *(в состав входят: пристройка, склад, гараж, забор, тротуар, калитка, ворота, асфальтное покрытие)* **общей площадью 223,9 кв. м с инв. № 633/С-10471, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624050100001000113 (право постоянного пользования) площадью 0,1103 га по адресу: Минская область, Мядельский район, г. Мядель, ул. Юбилейная, 6.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **32 736,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **3 273,00** бел. руб.). *Цена снижена на 60 %.*

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901,код категории платежа OTHR. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 05.02.2021, 08.05.2021, 27.01.2022. Аукцион состоится **12.04.2023** в 1**2.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.04.2023** до **17.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11. Тел. для осмотра (8029) 339 76 42.**

УНП 600074908

Закрытое акционерное общество «Смолевичи Молоко»

(место нахождения: 222201, Республика Беларусь, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Социалистическая, 54 б) сообщает, что директором ЗАО «Смолевичи Молоко» 10.03.2023 принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг. Формирование реестра акционеров осуществляется по состоянию на 10.03.2023.

УНП 690668083

Свидетельства о постановке на учет первичных организаций ОО «Белорусский союз женщин» за номерами 01-199, 01-200, 01-203, 01-206, 01-207, 01-208, 01-210, 01-212, 01-213, 01-214, 01-215, 01-216, 01-218, 01-219, 01-220, 01-224, 01-226, 01-231, 01-235, 01-238 **считать недействительными в связи с утерей.**

УНП 201005084

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объекта недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 5 %):

№ объекта	Характеристика имущества	Местонахождение имущества	Начальная цена
1	Капитальное строение (назначение: здание специализированное финансового назначения; наименование: административное здание) с инвентарным номером 253/С-497557, общей площадью: 670,1 кв. м	Витебская обл., г. п. Россоны, ул. Лапенко, 4	140 253,10 (сто сорок тысяч двести пятьдесят три рубля 10 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 23 375,52 (двадцать три тысячи триста семьдесят пять рублей 52 копейки)

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Заявление на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 в срок до 16.00, в пятницу до 15.00 по 14.04.2023.

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 14.04.2023 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

Аукцион состоится 18.04.2023 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.

Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ, а также расходы по оценке имущества в размере 15,56 руб. без НДС.

Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник приобретает объекты основных средств по стоимости 1 215,54 руб. (в т. ч. НДС 20 %): регулятор системы теплоснабжения SR-1K (инв. № 214990021702870), кассовая кабина (инв. № 214990021700204), кассовая кабина (инв. номер 214990021700205), кассовая кабина (инв. № 214990021700206), кассовое ограждение (инв. № 214990000002663), кондиционер McQuay MCM050DR/MLC050C (инв. № 214990000002141), кондиционер FIJI RSW 14 R (инв. № 214990021700406), электросчетчик CE 301 R33 146-JAVZ 3-ф (5-100A) (инв. № 377682), счетчик воды «Струмень» СВ-40 (Т-30) (инв. № 516164), теплосчетчик тепла и воды SKU 02 U1 (инв. № 214990021700404).

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения.

Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19.

РУП «Институт недвижимости и оценки»

Продавец: ОАО «Белсвязьстрой». Филиал № 5, Брестская обл., г. Брест, ул. Красногвардейская, 106, тел. 8016350383. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф. 8 (016) 240-87-01. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. Условия продажи: без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Условия оплаты: согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона в течение 3 рабочих дней со дня аукциона. Срок возможного отказа от проведения аукциона: не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. Шаг аукциона: 5 % от предыдущей названной цены

Аукцион состоится 18 апреля 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона: www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 17 апреля 2023 г. до 17.00

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Лида-агротехсервис». Аукцион состоится 31.03.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1	
Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: - капитальное строение, инв. № 420/С-42745 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – проходная), общей площадью 48,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73, корп. 1; - капитальное строение, инв. № 420/С-4534 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание конторы), общей площадью 204,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73; - капитальное строение, инв. № 420/С-100411 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), общей площадью 13678 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73, сооружение благоустройства; - капитальное строение, инв. № 420/С-4533 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – душевая), общей площадью 46 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73; - оборудование: кран козловой КК 10-25, 1976 г. в.; кран козловой КС-12,5/20, 1985 г. в.; котел газовый напольный К45-8Е23 Supraline, 2011 г. в.; комплектная трансформаторная подстанция (КТП) № 137, 1993 г. в. Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000011000280, площадью 2,5117 га (назначение – для обслуживания производственной территории), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, 73. Земельный участок является неделимым и на данном земельном участке расположены иные объекты, не подлежащие продаже. Оформление земельного участка будет производится после приобретения объекта в порядке, предусмотренном законодательством Республики Беларусь
Начальная цена продажи	181 194 руб. (сто восемьдесят одна тысяча сто девяносто четыре рубля) с учетом НДС
Сумма задатка	18 119 руб. (восемнадцать тысяч сто девятнадцать рублей)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 29.03.2023 до 15.00
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 26.10.2022	
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony	

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

Извещает о внесении изменений в извещение о проведении аукциона по продаже имущества, принадлежащего Республиканскому дочернему унитарному предприятию по обеспечению нефтепродуктами «Белоруснефть-Гроднооблнефтепродукт».

ЛОТ 12: «Трактор Беларус 82.1». Мощность – 81 л. с. Номинальная частота вращения – 2200 об/мин. Число цилиндров – 4 шт. Рабочий объем – 4,75 л. Число передач: вперед/назад – 9/2. Год производства – 1999, регистрационный знак СК-4 5818
Телефон для справок 55-87-71– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grino.by

УНП 590661544

НОН-ФІКШН АБО КАЗКА?

Дыскусія пра дзіцячую літаратуру

Кніга і выхаванне цесна ўзаемазвязаныя. Ад мастацкай якасці, ад тэматычнай скіраванасці папулярнай дзіцячай літаратуры залежыць, якім вырасце цэлае пакаленне. Таму на Мінскай міжнароднай кніжнай выставе, якая адбудзецца ўжо вельмі хутка, з 22 да 26 сакавіка, вялікая ўвага будзе аддадзена літаратуры для юнага чытача. Напярэдадні кніжнага форуму мы папрасілі выказацца пра кнігі для гэтай самай складанай чытацкай аўдыторыі экспертаў па дзіцячай літаратуры. У дыскусіі «Звязды» бяруць удзел дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК, першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук Ірына БУТОРЫНА, намеснік дырэктара Нацыянальнага інстытута адукацыі па навукова-даследчай рабоце, доктар педагагічных навук, дацэнт Вольга ЗЕЛЯНКО, дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк Мінска Таццяна ШВЕД і пісьменніца Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ.

— Як сёння дзіцячая кніга выхоўвае патрыятызм і гістарычную памяць і ці абавязкова гэта павінна быць «літаратура факта»?



К. ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ: Гэта неабавязкова павінна быць «літаратура факта». Праз казкі маленькі чалавек спасцігае свет, усведамляе, хто ён, адкуль ён, хто яго продкі, якая яго радзіма. Вельмі моцнае ўздзеянне аказваюць народныя казкі, у якіх захоўваецца мудрасць пакаленняў, спрадвечныя каштоўнасці нашага народа, зададзены маральныя арыенціры. Усе дакладнасці будуць прачытаныя пазней, а ў дзіцячыя сэрцы праз казкі павінна трапіць зерне, якое дасць моцныя парасткі любові да роднай зямлі, свайго народа, культуры і гісторыі. Не толькі народныя казкі выхоўваюць патрыятызм і гістарычную памяць. Праз свае творы робяць тое і сучасныя пісьменнікі.

А. СТЭЛЬМАХ: Я сказала б, што беларуская дзіцячая літаратура ўвогуле мае патрыятычную скіраванасць. Па-першае, родная мова абуджае цікавасць да спазнання свету, садзейнічае праяўленню павагі да мінулага. Па-другое, многія творы, не звязаныя непасрэдна, скажам, з тэмай вайны, маюць не менш важнае патрыятычнае гучанне, бо яны прысвечаныя таму, як жылі нашы продкі, што перадалі нам у спадчыну. Пісаць пра гэта не менш цікава, чым пра прыдуманыя цуды. Карысць ад такога чытання павялічваецца, бо яно перадае нашы нацыянальныя каштоўнасці.



Т. ШВЕД: Факты — добрая рэч, з імі нельга спрачацца. Але калі мастацкая кніга напісана даступнай мовай, добрым стылем, тады дзеці чытаюць з задавальненнем, сочаць за сюжэтнай лініяй. І памятаюць усё жыццё тое, што спазналі. Вось і падказка пісьменнікам: гістарычная тэма, патрыятычная — галоўныя ў творчасці.



А. БАДАК: Жанр нон-фікшн у дзіцячай і падлеткавай літаратуры даганяе па сваёй папулярнасці мастацкую літаратуру. Гэта відаць і па кніжках, якія выдае «Мастацкая літаратура» — сярод лідараў продажу ўжо на працягу некалькі гадоў «Дзіцячы атлас Беларусі». А ёсць яшчэ папулярная серыя «Сто пытанняў пра Беларусь». Яе выпуск «Дзесяць пытанняў пра рэкі і азёры Беларусі» па выніках лютага знаходзіцца ў лідарах продажаў. І такія выданні таксама выхоўваюць патрыятызм і гістарычную памяць. Таму што калі мы расказваем пра рэкі, гаворым і пра гісторыю, летапісную Нямігу, легендарнае мора Герадота. Да таго ж варта гаварыць і пра кніжкі, напісаныя не сёння. Напрыклад, мы перавыдалі кніжку «Ніколі не забудзем», першае выданне якой з'явілася адразу пасля вайны. У ёй сабраны ўспаміны тагачасных дзяцей, што перажылі вайну. Столькі часу прайшло, а гэтая кніжка ўражвае і вельмі запатрабаваная. Калі з сённяшнімі дзецьмі размаўляюць іх равеснікі, распавядаючы пра жахі вайны, іх словы даходзяць і да сэрца, і да розуму юнага чытача.



В. ЗЕЛЯНКО: У сучаснай беларускай дзіцячай літаратуры творы нон-фікшн не вельмі распаўсюджаныя, але ў кола дзіцячага чытання падобныя творы трапляюць. Гэта мемуары славутых людзей, летапісныя сведчанні, падарожныя нататкі. Гэта і караткевічаўскія эсэ, і дакументальная проза Максіма Гарэцкага, і зборнік сведчанняў пра вайну «Я з вогненнай вёскі» Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка. Падобныя тэксты выклікаюць у моладзі шчыры давер, бо сказанае пацверджана рэальнымі ўспамінамі, фактамі, згадкамі. Разам з тым такая літаратура мае выразнае патрыятычнае гучанне — не дэкларатыўнае, а асабістае, чалавечае. Вядома, такія кнігі могуць быць цяжкія для чытання без каментарыяў дасведчанага даслага, але яны — добрая прышчэпка не толькі ад манкурцтва, але і ад хлусні, двудушнасці. Не трэба забывацца і пра даведачныя выданні, якія таксама адносяцца да «літаратуры факта». У Беларусі гэта найперш гісторыка-дакументальны цыкл кніг «Памяць», вядомы з якіх паспяхова выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе.



І. БУТОРЫНА: Патрыятызм — вельмі глыбокае пачуццё, цёплыя, кранальныя адносіны да бацькоў, роднага дому, школы, горада ці вёскі, да сваёй Радзімы. Таму, на мой погляд, выхоўваць могуць не толькі гістарычныя факты. Думаю, што вялікую працу на глебе выхавання дзяцей малодшага школьнага ўзросту могуць выконваць апавяданні, вершы, творы іншых жанраў, у якіх дзіця эмацыянальна адчувае блізкія і паважлівыя адносіны паміж настаўнікамі і вучнямі, членамі сям'і, бачыць простыя прыклады карысных спраў, якія разам могуць выконваць дарослыя і дзеці.

— Якія метады сёння найбольш эфектыўна выкарыстоўваць, каб абудзіць у дзяцей цікавасць да чытання?

А. Стэльмах: Асновай, зразумела, застаецца сама кніга: яе змест, афармленне. Але сёння гэтага ўжо недастаткова для актыўнага чытання. Ёсць вялікі выбар інфармацыі, і справа, нас, дарослых, — сарыентаваць дзяцей у вызначэнні прыярытэтаў, у тым ліку і пераканаць у перавагах менавіта папяровага носьбіта — кнігі. Таму пісьменнікі і прыдумваюць розныя актыўнасці (пераапранаюцца феямі, чараўнікамі, ствараюць квэсты, вырабляюць цацкі, праводзяць майстар-класы і г. д.). І гэта сапраўды спрацоўвае, бо дзеці самі становяцца актыўнымі ўдзельнікамі кніжнага дзеяння, захапляюцца, калі кніжныя старонкі ажываюць. Пасля чаго ахвотна набываюць кнігі. З аўтографам!

К. Хадасевіч-Лісавая: З мноства парад, як дапамагчы дзіцяці адкрыць для сябе свет чытання, назаву некалькі. Першая і вельмі важная — прыклад бацькоў. Калі дзіця бачыць за чытаннем тату і маму, матывацыя павышаецца ў разы. Каб зацікавіць малога кнігай, я параіла б запісацца і хадзіць разам з ім у бібліятэку. Ён менавіта сам павінен выбрать кнігу, тут нельга навязваць свае варыянты, бо атмасфера бібліятэкі як дзівоснага дома кніг і яго як дарагога госця знікне і чытанне стане падобным да прымусу. Дзіця павінна само даць бібліятэкару абраную ім кнігу і ўсвядоміць, калі неабходна яе вярнуць. Дарэчы, вяртаць таксама трэба толькі самому чытачу. Яшчэ адным пунктам адзначу, што неабходна своечасова і правільна навучыць дзіця чытаць. Своечасова — гэта да таго, як чытанне ўжо мае неабходнасць — для ўрокаў у школе. Цудоўна, калі вы будзеце ладзіць сумесныя чытанні і прыдумаеце для гэтага нешта цікавае. Напрыклад, можна набыць «чароўны пясочны гадзіннік» хвілін на трыццаць. І пакуль яго залатыя пясчынкі перасыпаюцца, ідзе час падарожжа ў кнігу. У гэтага метаду ёсць сакрэт: трэба сядаць каля «чароўнага гадзінніка» не час ад часу, як будзе вольны вечар, а пастаянна. Паспрабуйце!

Т. Швед: Дзяржава робіць захады па добрым камплектаванні бібліятэк, якія наведваюць дзеці і падлеткі. Сучасныя кнігі, інтэр'еры, якасная культурна-асветніцкая работа, магчымасць бясплатна браць кнігі дадому... Добра, калі дарослыя чытаюць дзецям услых, наогул паказваюць прыклад чытання! Аздабленне кнігі адыгрывае ў некаторых выпадках ключавую ролю. Ілюстратар выданняў для малых павінен вельмі сур'ёзна ставіцца да сваёй справы.

А. Бадак: У першую чаргу гэта сустрэчы з аўтарамі, з супрацоўнікамі выдавецтва. Спрацоўвае і рэклама на тэлебачанні, у СМІ. Вялікі рэзананс маюць фестывалі дзіцячай кнігі, якія ладзяцца СПБ. Важныя круглыя сталы. Не так даўно прайшоў пленум Саюза пісьменнікаў Беларусі, прысвечаны дзіцячай літаратуры. На ім прысутнічалі не толькі пісьменнікі, але і людзі, якія маюць непасрэднае дачыненне да прапаганды дзіцячай літаратуры, — ад бібліятэкараў да прадстаўнікоў міністэрстваў. Дзякуючы такім кантактам і нашым бібліятэкам прасцей працаваць, а таму ж Міністэрству адукацыі — фарміраваць праграму для школ па літаратуры.

В. Зелянко: Варта практыкаваць сумеснае чытанне кнігі дарослым і падлеткам. Гэта дае магчымасць скіраваць увагу на важныя сэнсаўтваральныя элементы тэксту, высветліць значэнне незразумелых слоў, разабрацца ў абставінах, што апісваюцца аўтарам. Па-другое, неабходна прапаноўваць для чытання тыя кнігі, якія былі б цікавыя канкрэтнаму юнаму чытачу. Па-трэцяе, сёння любая кніга ўступае ў «канкурэнтную барацьбу» за чытача. Таму дарослым трэба прыкласці намаганні для рэкламы найлепшых узораў мастацтва слова (гэта можа быць сціслы пераказ да самага напружанага моманту, стварэнне буктрэйлераў, прагляд уступнага роліка і іншае). Па-чацвёртае, творчасць пісьменніка варта разглядаць праз кантэкст надзённых праблем і гістарычнай рухомасці мастацкага твора.

І. Буторына: Безумоўна, усе класічныя метады навучання і выхавання ствараюць грунтоўную метадычную базу. Аднак у цяперашні час добра працуюць метады медыядукацыі, арганізацыі літаратурна-творчай дзейнасці вучняў, інтэрактыўнага ўзаемадзеяння з сацыякультурнымі ўстановамі.

— Ці спрацоўвае метад узроставай маркіроўкі, уведзены некалькі гадоў таму?

Т. Швед: Так! Супрацоўнікі аддзела фарміравання бібліятэчнага фонду звяртаюць асаблівую ўвагу на ўзроставую маркіроўку пры набыцці выданняў. Кніг паступае шмат, і пры наяўнасці маркіроўкі бібліятэкару больш зручна арыентавацца ў навінках.

К. Хадасевіч-Лісавая: Ведаю ад бацькоў, настаўнікаў, бібліятэкараў, што праз прысваенне маркіроўкі здараюцца непаразуменні. Калі на кнізе пазначана «6+», гэта не сведчыць аб тым, што яна адрасавана дзецям старэйшага ўзросту. Гэта папярэджанне аб магчымасці негатыўнага ўплыву інфармацыі, якая там ёсць. Але адказнасць за выбар кнігі ўсё ж канчаткова за бацькамі, а не кнігавыдаўцамі. Калі я ў сацсетках напісала, што ў мяне выйшла новая кніга «жахліўчыкаў» для дзяцей, у мяне запыталася мама маёй юнай чытачкі: ці падыдзе кніга для яе дачкі? Дзяўчынцы сем гадоў, але яна мае багаты чытацкі досвед і яны з мамай прачыталі шмат маіх кніг. Я паглядзела на маркіроўку — «12+». Напісала адказ, што, згодна з рэкамендацыямі па ўзросце, ім рана. Хоць калі я пісала кнігу, строга прытрымлівалася правіла не нашкодзіць юным чытачам, не запалохаць іх, наадварот, кніга дапаможа пераадолець страхі. Праз непрацяглы час тая ж мама зноў напісала мне, што набыла кнігу і яны з вялікім задавальненнем прачыталі «жахліўчык» разам з сямігадовай дачкой. Абедзвюм вельмі спадабалася. Адказнасць у гэтым выпадку была цалкам за мамай, што абсалютна правільна. А ўвогуле, старыя добрыя рэкамендацыі «Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту», «Для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту» ўяўляюцца мне зручнай і зразумелай навігацыяй.

А. Стэльмах: Не думаю, што ўзроставая маркіроўка прынцыпова ўплывае на выбар патрэбнай літаратуры. Хутчэй тут спрацоўвае ўласны густ таго, хто цікавіцца кнігай.

А. Бадак: Да ўзроставай маркіроўкі наша выдавецтва падыходзіць з усёй адказнасцю. Але бывае не заўсёды проста вызначыць, да якой дзіцячай катэгорыі належыць тая ці іншая кніжка. Сённяшнія дзеці часам абганяюць свой фізічны ўзрост. Часам бачу, што я ў іх узросце не зразумеў бы таго, што разумеюць яны. Яшчэ хочацца не адштурхнуць дзіця ад цікавай кніжкі. Вось, напрыклад, ёсць маркіроўка «12+» і «16+». А калі юнаму чытачу 13, 14, 15 гадоў — якая катэгорыя яму бліжэй? Магчыма, ён не возьме кнігу «12+», бо палічыць яе нечым «для малых», а «16+» яму ў бібліятэцы не дадуць.

В. Зелянко: Маркіроўка была ўведзена для абароны дзіцяці ад інфармацыі, якая здольная нанесці шкоду яго здароўю і развіццю, правакуе на антысацыяльныя і супрацьпраўныя дзеянні, дыскрэдытуе інстытут сям'і. Як паказаў час, навучэнцы пры выбары кнігі для чытання па-ранейшаму кіруюцца анатацыяй, меркаваннем аднагодкаў, рэкамендацыямі педагогаў і бацькоў, не звяртаючы асаблівай увагі на ўзроставае абмежаванне. Разам з тым маркіроўка служыць арыенцірам для бібліятэкараў, якія толькі з дазволу бацькоў выдаюць кнігі, што не адпавядаюць узросту чытачоў, і, безумоўна, для саміх бацькоў.

І. Буторына: З аднаго боку, гэта арыенцір для дарослых, якія дапамагаюць дзецям выбраць кнігу. З іншага — гэта і інструкцыя для саміх маленькіх чытачоў. Мне здаецца, што ў большай ступені маркіроўка спрацоўвае для дарослых, якія рыхтуюць кнігі да сустрэчы з чытачамі. І гэта ўжо нямала.

— Як вы ставіцеся да літаратуры Young Adult і ці развітая гэтая ніша ў беларускай літаратуры?

А. Стэльмах: Сутнасць папулярнай сёння ў моладзі літаратуры Young Adult (маладыя дарослыя) у тым, каб герой гаварыў з чытачом на адной мове і каб абмяркоўваліся праблемы, якія хвалююць маладых людзей у рэальным жыцці. На мой погляд, выдатным прыкладам такой літаратуры служыць кніга Яўгена Хвалея «Прынцэса з тусоўкі», якая вытрымала ўжо пяць перавыданняў.

К. Хадасевіч-Лісавая: Мяркую, пісаць для аўдыторыі ад 12 да 20 гадоў складана. У беларускай літаратуры гэтая ніша не пустая, але чакае новых выдатных аўтараў, ад якіх патрабуецца размаўляць на адной мове з чытачамі, ведаць тэмы, якія іх цікавяць, умець даць адказы на пытанні, што іх турбуюць, і рабіць тое так, каб чытачы не адчулі павучання, каб на іх не ціснуў жыццёвы досвед аўтара. Чытачы хацелі б атрымаць адказы на вострыя пытанні. Таму аўтар нясе вялікую адказнасць за тое, якія парады ў яго творах зноймуць чытачы. Кожнае слова трэба ўзважыць і быць упэўненымі, што нікому не пашкодзіш. Выдатна, калі ў YA-літаратуры ёсць кнігі з сацыяльнай тэматыкай, на старонках якіх пісьменнікі размаўляюць з падлеткамі аб вельмі важным:

ад праблем з вучобай і складаных адносін з аднагодкамі да перажыванняў страты блізкіх людзей. Але пасля прачытання кнігу трэба абмеркаваць. Падлетку будзе значна прасцей абмяркоўваць паводзіны персанажаў, а не свае, а зробленыя высновы дапамогуць у вырашэнні падобных праблем у яго ўласным жыцці.

Т. Швед: Young Adult — літаратура, якая павінна быць. Яе чытачы — розныя па характары, поглядзе на жыццё, адносінах у падлетквым асяроддзі і іншых справах. І тэмы гэтай катэгорыі (каханне, сяброўства, самастойнасць) цікавяць не толькі падлеткаў, але і дарослых. Узрост чытача мае значэнне, але хтосьці становіцца дарослым не па гадах, а менавіта па жыццёвых абставінах.

А. Бадак: Неяк я спрабаваў для сябе вызначыць, што ж гэта за ўзроставая катэгорыя — падлеткі і моладзь? І заблытаўся. Калі дакладна дзіця перастае ў падлетка, потым — у дарослага чалавека? Ёсць літаратура, вядома, якая ад пачатку пішацца для пэўнай узроставай катэгорыі. Але я, калі пісаў аповесць «Адзінокі васьмікласнік хоча пазнаёміцца», не думаў, што гэта будзе твор для падлеткаў, для моладзі або для дарослага чытача. Аўдыторыя вызначылася сама па сабе.

В. Зелянко: Літаратура Young Adult — адносна новая з'ява ў сусветнай культуры. Нягледзячы на тое, што яе мэтавай аўдыторыяй з'яўляюцца падлеткі, іх бацькі (а часам і бабулі, і дзядулі) таксама ставяцца да яе з вялікай цікавасцю. Відавыя і тэматычныя межы Young Adult пакуль яшчэ досыць размытыя (гэта можа быць і фантастычная літаратура, і ваенная, і гістарычная), яе галоўныя асаблівасці: займальны сюжэт, дынамічны аповед, лёгкая мова і героі-падлеткі, якія дзейнічаюць у нятростых дарослых абставінах. Літаратура Young Adult проста і без залішняга дыдактызму распавядае аб складаным: зносінах паміж аднагодкамі, унутрысямейных адносінах, булінгу, сыходзе блізкіх, невылечных хваробах, псіхалагічных праблемах і іншым. Яе героі — часта аўтсайдары, не падобныя да іншых, яны не ўпісваюцца ў агульнапрынятыя рамкі. Няма сумнення, літаратура Young Adult патрэбная і важная, аднак у працэсе станаўлення гэтага жанру з'яўляецца шмат тэкстаў невысокай якасці. Да літаратуры Young Adult звяртаюцца і беларускія пісьменнікі — як вопытныя майстры пяра (Андрэй Федарэнка), так і маладое пакаленне літаратараў (Станіслава Умец). Але пакуль можна канстатаваць, што ў беларускай літаратуры гэтая ніша толькі пачынае распрацоўвацца.

І. Буторына: Трэба адзначыць, што дзеці сталеюць цяпер даволі хуткімі тэмпамі, таму, напэўна, і героі літаратуры Young Adult будуць спяшацца паспяваць за імі. Гэта пакажа час, аднак вельмі хацелася б, каб у вобразах сучасных падлеткаў больш яскрава адчувалася маральная прыгажосць асобы. Таму што любімыя героі — прывабны арыенцір для чытачоў.

— Чаму сёння маленькія дзеці аддаюць перавагу адукацыйнай літаратуры, энцыклапедыям і даведнікам перад мастацкай? Прычына — у нізкім узроўні мастацкай у параўнанні з высокім узроўнем дзіцячых энцыклапедый, ці проста дзеці змяніліся?

К. Хадасевіч-Лісавая: Я не валодаю статыстыкай, але, па маіх уласных назіраннях, мастацкія кнігі не страчваюць пазіцыі. Проста яны маюць большую патрэбу ў рэкламе. Іх трэба прадстаўляць, бо пад вокладкай пакуль невядомы чытачу свет аўтарскай фантазіі. А энцыклапедыі — выданні адукацыйныя, якія знаёмяць з цікавымі і займальнымі фактамі. Мяркую, яны маюць попыт і прадаюцца добра яшчэ і таму, што ўсё ж кніга застаецца найлепшым падарункам, а калі чалавек прыходзіць ў кнігарню і думае, што выбраць, энцыклапедыя — той варыянт, які падыходзіць любому юнаму чытачу, а вось мастацкую кнігу падабраць больш складана, бо трэба ведаць, што прыйдзецца даспадобы...

Т. Швед: Так, дзеці змяніліся. Але ж і кнігі, якія прапануюць гандаль і бібліятэкі, таксама розныя. Дзеці добра чытаюць класічную літаратуру, фэнтэзі, прыгоды, дэтэктывы... За 2022 год у дзіцячых бібліятэках Мінска чытачам да 15 гадоў было выдадзена 1 540 405 экземпляраў інфармацыйных рэсурсаў, з іх — 1 083 812 экземпляраў мастацкай літаратуры. Энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі чытаць лягчэй, бо знаёмімся толькі з неабходнай інфармацыяй.

А. Стэльмах: Нязменнай застаецца цікавасць да мастацкай літаратуры. Саюз пісьменнікаў Беларусі неаднойчы праводзіў даследаванні па запатрабаванасці кніг сучасных літаратараў у бібліятэках краіны. У большасці аўтараў рэйтынг даволі высокі. На мой погляд, юны чытач усё той жа: цікаўны, удумлівы, няўрымслівы. Ён толькі пазнае свет, і яму важна атрымліваць веды з розных крыніц. Таму на кніжных паліцах запатрабаваны ўвесь адукацыйны арсенал: энцыклапедыі, слоўнікі, атласы... Актыўна развіваецца такі літаратурны жанр, як нон-фікшн. У ім вельмі важныя асоба аўтара, яго бачанне свету, яго ўласны досвед. Такая літаратура не толькі дае веды, але і стымулюе да дзеяння. Лічу, што для пісьменнікаў гэта вельмі ўдзячны напрамак.

А. Бадак: Сённяшнія дзеці выраслі ў свеце гаджэтаў. Першымі кніжкамі ў нашага пакалення былі казкі, потым — прыгодніцкая літаратура... У сённяшніх малых — дзіцячыя энцыклапедыі. Усё прыходзіць да іх не праз вобразы, не праз цікавыя гісторыі, а праз факт. Інтэрнэт уплывае на дзяцей і падлеткаў больш, чым тая ж мастацкая літаратура. З'яўляецца ўсё больш дзіцячай «літаратуры факта». Але гэта сведчыць не пра нізкі ўзровень мастацкай літаратуры, а проста адбываецца запаўненне ніш, якія не былі запоўненыя раней.

В. Зелянко: Не пагаджуся з тым, што маленькія чытачы выбіраюць літаратуру, у якой пераважае пазнавальны кампанент. Дзеці чытаюць тое, што ім прапануюць дарослыя. Вельмі часта мы забываем, што дзецям неабходныя розныя кнігі: і навукова-папулярныя, і мастацкія, і для набыцця новых ведаў, і для развіцця ўнутранага свету, і для адпачынку. Важна разумець, што на розных этапах развіцця асобы патрэбныя розныя кнігі. Напрыклад, старшым дашкольнікам і малодшым школьнікам падабаюцца гісторыі, якія ўтрымліваюць інфармацыю аб прычынах і наступствах розных падзей, а таксама тлумачаць, як пабудаваны свет. Гэта не выключае неабходнасці чытання твораў пра сяброўства, пра мадэлі паводзін у розных жыццёвых сітуацыях. Навукова-папулярная літаратура дапамагае засвоіць навуковыя факты, а мастацкая — развіваць фантазію, эмацыянальную сферу, эмпатыю, кагнітыўныя функцыі, узбагачаць слоўнікавы запас.

І. Буторына: Напэўна, гэта прыкмета нашага імклівага часу — звяртаць увагу менавіта на тую інфармацыю, якая спатрэбіцца ў штодзённым жыцці. Гэта важнае ўменне інфармацыйнай культуры, якое дапаможа не згубіцца ў свеце інфармацыі. Але на жыцці маленькіх чытачоў суправаджаюць бацькі і настаўнікі, якія і павінны больш звяртаць увагу на мастацкую літаратуру.

— Як у свеце сацыяльных сетак і самадзейных кніжных блогераў вярнуць уплыў прафесійных бібліёграфаў на дзіцячае чытанне?

К. Хадасевіч-Лісавая: Тут зноў хочацца нагадаць пра адказнасць дарослых. Заўсёды ведайце, што глядзяць вашы дзеці, чыім меркаванням яны давяраюць, якія кнігі чытаюць. І ў сацсетках можна знайсці карысную інфармацыю, атрымаць водгукі на кнігі, адкрыць для сябе новых аўтараў, але ўсё гэта, перш чым даць кнігу дзіцяці, трэба правяраць. Самы надзейны варыянт — прафесійнае меркаванне.

Т. Швед: І сапраўды, у сецыве шмат рэкамендацый па чытанні кніг рознай тэматыкі, аб навінках літаратуры. Кніжныя блогеры займаюць асобнае месца ў інтэрнэце. І кожны чытач можа знайсці пэўныя парады для чытання. Але ж і прафесійныя бібліёграфы аказваюць уплыў на чытанне сучасных дзяцей і падлеткаў. Дзе чытач шукае інфармацыю аб кнігах, там і знойдзе: у сецыве, бібліятэцы, кніжнай краме. На сайце ЦСДБ г. Мінска размяшчаецца інфармацыя бібліяграфічнага аддзела пра навінкі літаратуры па розных тэмах, і гэта рэальна ўплывае на колькасць наведвальнікаў дзіцячых бібліятэк сталіцы.

А. Стэльмах: Але толькі адным пісьменнікам абудзіць усеагульную цікавасць да чытання не пад сілу. Патрэбна больш пераканаўчая дзяржаўная палітыка ў тым, каб людзі ўсвядомілі: будучыня кожнага залежыць ад колькасці, як ні дзіўна, прачытаных кніг. Толькі чалавек, які чытае і стаў высокаадукаваны асобай, здольны ў поўнай ступені ажыццявіць свае мары. Карацей, неабходная мода на чытанне. Чытанне ўсёй сям'ёй!

А. Бадак: Сёння і бібліёграфам, і пісьменнікам, і ўвогуле ўсім установам, якія маюць нейкае дачыненне да дзіцячай літаратуры, выхавання, трэба больш актыўна выходзіць у інтэрнэт. Рабіць папулярныя сайты, блогі, дзе атрымаеш цікавую і карысную інфармацыю, якая датычыцца дзіцячага чытання.

В. Зелянко: На самай справе дастаткова наведваць з дзіцем бібліятэку. Аповед прафесіянала пра кнігу больш эфектыўны за любы інтэрнэт-рэсурс. Сучасныя дзіцячыя бібліятэкі маюць электронныя базы даных ледзьве не па ўсіх праграмных творах. Бібліёграфы, як і блогеры, штодня шчыруюць ва «Укантакце», «Фэйсбуку», «Інстаграме», праводзяць квэсты, завочныя экскурсіі і выставы навінак. У маркетынгу ёсць паняцце «пункт кантакту з кліентам». Дык вось, гэты пункт сустрэчы чытача і тэксту сёння перанесены ў віртуальную прастору. І важная задача — даць дзіцяці магчымасць знайсці там прафесійнага бібліёграфа, сапраўднага літаратуразнаўцу. Не варта скідваць з рахунку і блогера-энтузіяста, і вопытнага чытача-карыстальніка.

І. Буторына: Я думаю, што не трэба стамляцца падкрэсліваць унікальнасць і прывабнасць кнігі. Напрыклад, мультыплікацыйныя фільмы, некаторыя рэкламныя ролікі створаны паводле твораў мастацкай літаратуры. Сучасныя метады медыяадукацыі дазваляюць якасна арганізаваць успрыманне і аналіз розных медыятэкстаў. Зносіны ў сацыяльных сетках — частка жыцця сучаснага чалавека, але чаму б не паспрабаваць выкарыстоўваць іх з адукацыйнымі мэтамі? Напрыклад, у час практыкі ў школе нашы студэнты — будучыня настаўнікі пачатковых класаў — спрабуюць распрацоўваць урокі літаратурнага чытання ў нестандартных формах: урок - літаратурны блог, урок - рэкламнае PR-агенцтва і іншае. А яшчэ вельмі важна працягваць супрацоўнічаць з бібліятэкамі.

— Якіх кніг сёння не хапае ў беларускай дзіцячай літаратуры?

К. Хадасевіч-Лісавая: Мабыць, у той ці іншай ступені ахоплены ўсе важныя тэмы. Хацелася б больш кніг пра сапраўднае сяброўства, важныя добрыя ўчынкі, пра шчырасць, сціпласць, дабрыню. У сучасным свеце проста неабходна закладваць гэтыя каштоўнасці ў дзіцячыя сэрцы.

Т. Швед: Патрэбныя кнігі па патрыятычным выхаванні, па развіцці гарманічнай асобы, маральна-этычнай тэматыкі. Ёсць попыт на кнігі для падлеткаў на беларускай мове пра сучаснае жыццё, сучасных герояў. Маленькім чытачам неабходныя кнігі на роднай мове, але яны павінны быць сучасна ілюстраваныя, зразумелыя для чытання. Трэба адзначыць, што цяпер ёсць шмат добрых беларускіх кніг з сучасным афармленнем.

А. Стэльмах: Большасць пісьменнікаў бачыць свайго чытача, які знаходзіцца ва ўзросце пачатковай або сярэдняй школы. Тут прапануў — сапраўднае кніжнае мора! А вось для тых, хто ў дзіцячым садку, кніжачак (асабліва на роднай мове) сапраўды малавата. Гэтак жа недастаткова кніг і для падлеткаў, якім асабліва важна зрабіць усвядомлены жыццёвы выбар. Кніжныя героі нярэдка ў тым становяцца прыкладам.

А. Бадак: Як сябар журы рэспубліканскага конкурсу «ЛітUP» сведчу, што там заўсёды вельмі шмат твораў, адрасаваных маленькаму чытачу. І на конкурс «Нацыянальная літаратурная прэмія» ў намінацыі «Дзіцячая літаратура» падаецца шмат аўтараў, якія пішуць для дашкольнікаў ці для малодшых школьнікаў. А вось тых, хто працуе для падлеткаў, мала. Чаму? Для падлеткаў пісаць нашмат цяжэй, чым для малых, іх цяжэй зацікавіць. Але разам з тым, калі ніша мала запоўненая, пісьменнікам працаваць у ёй прасцей, чым у нішы, якая перанасычаная, прасцей быць заўважанымі чытачамі і крытыкамі.

В. Зелянко: Беларуская літаратура мае вострую патрэбу ў творах для падлеткаў (пра іх штодзённае жыццё, пра жыццё іх аднагодкаў з іншага часу, пра першае каханне, пра тое, як камунікаваць, сябраваць, паводзіць сябе ў розных сітуацыях, як дапамагчы сабе і іншым, як спраўляцца з праблемамі). Хацелася б, каб гэтыя творы вызначаліся цікавым сюжэтам, неслі пэўны выхаваўчы і гуманістычны пасыл, прапагандавалі традыцыйныя каштоўнасці, былі напісаны ўзорнай літаратурнай мовай, мелі мастацкую значнасць. Пры адпаведнасці названым крытэрыям такія творы маглі б быць уключаны ў сучасныя вучэбныя праграмы па літаратуры.

І. Буторына: Сучасная беларуская дзіцячая літаратура жанрава і тэматычна даволі разнастайная. Прыемна, што перавыдаюцца творы класікі, выдаюцца і зусім маладыя сучасныя творцы. Думаю, што чытачы знойдуць кнігі па сваіх інтарэсах. Галоўнае, як ужо адзначалася вышэй, каб дарослыя не стамляліся паказваць дзецям прывабнасць і сучаснасць кнігі, дапамаглі набыць звычку наведваць бібліятэкі і кнігарні, разам з маленькімі чытачамі чыталіі і абмяркоўвалі творы розных тэм і жанраў.

Падрыхтавала Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Агенцтва Moody's пагоршыла да негатыўнага прагноз па банкаўскай сістэме ЗША

Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Moody's пагоршыла прагноз па банкаўскай сістэме ЗША да негатыўнага на фоне сітуацыі з банкруцтвам амерыканскіх банкаў Signature Bank (SNY) і Silicon Valley Bank (SVB), паведаміла ТАСС. У заяве Moody's гаворыцца, што прагноз зменены да негатыўнага, «каб адлюстраваць хуткае пагаршэнне аперацыйнага асяроддзя пасля адтоку дэпазітаў з Silicon Valley Bank (SVB), Silvergate Bank і Signature Bank (SNY), а таксама пасля банкруцтва SVB і SNY». Гэты крок дэманструе пагаршэнне сітуацыі ў банкаўскай сферы Злучаных Штатаў. Паводле даных агенцтва, амерыканскія банкі сутыкаюцца з рэзкім лішкам дэпазітаў на фоне фіскальнага стымулявання, які ўзнік падчас пандэміі каранавіруса, а таксама нізкіх ставак. Некаторыя фінустановы, адзначае Moody's, уклалі гэтыя дэпазіты ў каштоўныя паперы з фіксаваным даходам, якія знізіліся ў цане пасля павышэння стаўкі ФРС. Гэта прывяло да значных страт.

ААН запытала $4,62 млрд для гуманітарнай дапамогі Афганістану

Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (УВКБ) і партнёры агучылі на брыфінгу ў Жэневе гуманітарны заклік — для дапамогі афганцам сёлета неабходна $4,62 мільярда, паведамляе сайт ААН. «У Афганістане на сённяшні дзень назіраецца адзін з самых маштабных і цяжкіх гуманітарных крызісаў у свеце. Рэкордныя 28,3 млн чалавек — каля дзвюх трацін насельніцтва, уключаючы жанчын і дзяўчынак, — маюць патрэбу ў гуманітарнай дапамозе і абароне», — гаворыцца ў паведамленні. Ва ўпраўленні лічаць, што фінансавая падтрымка афганцаў застаецца крытычна важнай для прадухілення голаду, хвароб, недаядання і смерці. Аналагічны заклік аб фінансаванні на 2022 год быў прафінансаваны толькі на 52 працэнты — быў атрыманы $321 млн з неабходных $623 млн. Акрамя таго, на брыфінгу быў агучаны рэгіянальны план для падтрымкі афганскіх бежанцаў і сем'яў у суседніх краінах — $613 млн.

Кіраўнік СААЗ выказаў упэўненасць у тым, што пандэмія COVID-19 завершыцца сёлета

Гендырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) Тэдрас Аданом Гебрэсус адзначыў, што «ў нейкі момант сёлета мы зможам сказаць, што COVID-19 завяршыўся як надзвычайная сітуацыя ў галіне грамадскай аховы здароўя, якая мае міжнароднае значэнне, і як пандэмія». Гебрэсус таксама нагадаў, што 11 сакавіка споўнілася тры гады з таго моманту, як СААЗ упершыню заявіла, што «глабальную ўспышку COVID-19 можна ахарактарызаваць як пандэмію». Ён таксама падкрэсліў, што на сённяшні дзень свет знаходзіцца ў лепшым становішчы, таму што апошнім часам рэгіструецца найбольш нізкая колькасць смяротных выхадаў з таго моманту, як COVID-19 набыў статус пандэміі. Сярод урокаў, якія свет павінен засвоіць у сувязі з распаўсюджваннем каранавіруса, кіраўнік СААЗ назваў неабходнасць належнага інвеставання ў сферу аховы здароўя, навуковых даследаванняў і міжнароднага супрацоўніцтва.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ЯК АМАЛАДЗІЦЬ СТАРЫ САД?

Даволі часта новыя ўладальнікі, калі набываюць участак з ужо наяўным пладовым садам, сутыкаюцца з вельмі старымі, бывае, што хворымі, дрэвамі з несфармаванымі кронамі.

Біялагічныя асаблівасці

Звычайна гэта перарослыя дрэвы з гнілой драўнінай, расколатымі стваламі, выламанымі галінкамі і да т. п. Але жыццёвая сіла яблынь і груш настолькі вялікая, што нават такія «напаўжывыя» экзэмпляры даюць нейкі ўраджай, які дазваляе гаспадарам думаць, што ў іх ёсць сад.

Сліва, вішня, чарэшня, абрыкос і іншыя костачкавыя пры старэнні паводзяць сябе не так, як семечкавыя. У асноўным тэрмін жыцця гэтых раслін невялікі. Але на месца адмерлага старога ствала ўстае шматлікі параснік.

Стары неапрацаваны костачкавы сад (асабліва сліва і вішня) уяўляе з сябе непраходныя зараснікі са шматлікай тонкаствольнай параслі.

Гэтак жа, як і ў семечкавых, тут валадараць патагенныя гніласныя грыбы і маецца шырокі спектр бактэрыяльных хвароб.

У дрэў ёсць свае біялагічныя асаблівасці росту. Семечкавыя культуры (далей гаворка пойдзе пра яблыні і грушы) у большасці выпадкаў даюць моцны вертыкальны ствол са шкілетнымі галінамі, якія адыходзяць. Утвараецца альбо канічная, альбо больш-менш шарападобная крона. Шчыльнасць яе залежыць ад колькасці парасткаў другога, трэцяга і наступных парадкаў. Дамінуе павышанае аблісцвенне ў шкоду якасці пладоў. Саміх пладоў у нейкія перыяды можа быць і шмат, але яны дробныя і не адпавядаюць смакавым якасцям, заяўленым у апісанні сартоў.

Зоймемся пальметай

Але калі якасць пладоў задавальняе, тады працэдура амаладжэння зводзіцца да выразання старых сухіх галін з прыкметамі маразабоін і гнілой драўніны, выраўноўвання і замазвання абломаў і расколін, выдалення галін, якія відавочна зацяняюць, і частковага прарэджвання кроны. Можна правесці краніраванне — абразанне ствала па вышыні і галін па даўжыні.

Як жа быць з дрэвамі, якія раслі не па правілах пладовага саду?

У агракультуры стандартная форма кроны пладовага семечкавага дрэва — пальмета. Слова palma азначае далонь, раскрытую далонь з пальцамі.

Складзіце свае рукі разам, раскрыйце далоні, як быццам трымаеце яблык, і вы атрымаеце чашападобную форму — пальмету, дзе ніводны палец-галінка не будзе заценены суседнім.

Пальмету пачынаюць фарміраваць, калі маладое дрэва дасягае вышыні 1,5-2 м.

Ствалы штамбуюць (прыбіраюць непатрэбныя парасткі) на вышыню 0,8-1 м, што забяспечвае зручнасць апрацоўкі як саміх штамбаў, так і прыствольных кругоў. Саму ж пальмету з часам адпускаюць да вышыні, зручнай для апрацоўкі з садовых драбінак, гэта значыць не вышэй за 4 м. У выніку атрымліваецца дрэва-чаша вышынёй да 4 м. Стаяць такія дрэвы не бліжэй за 3 м адно ад аднаго. Гэта дае магчымасць бесперашкоднага абслугоўвання, забяспечвае добрае праветрыванне і паспяховае апыленне.

Ці можна сфарміраваць пальмету на старым дрэве з высокім асноўным ствалом? Тэарэтычна так. Нейкае падабенства з часам атрымаць можна. Але для гэтага давядзецца значна пакараціць дрэва па вышыні, абрэзаць або выдаліць некаторыя шкілетныя галіны. Першы час такое зноў сфарміраванае дрэва выглядае неэстэтычна. Паступова на абрэзаных галінах з'явяцца маладыя парасткі, з якіх можна будзе сфарміраваць нейкае падабенства пальметы.

Баланс каранёў і кроны

У норме ў дрэва збалансавана біямаса надземнай і падземнай частак. Карані і галіны гарманальна ўплываюць адзін на аднаго, стымулюючы або тармозячы роставыя працэсы. Калі мы выдаляем большую частку кроны, колькасць пажыўных, гарманальных і біялагічна актыўных рэчываў, якія паступаюць з каранёвай сістэмы, значна большая, чым патрабуецца для абрэзанай кроны.

У выніку прачынаюцца патэнцыяльныя пункты росту (якія знаходзяцца ў камбіі) і спячыя пупышкі. У кроне ў першы вегетацыйны сезон пасля абразання з'яўляецца велізарная колькасць маладых парасткаў-ваўчкоў у шкоду пладовым парасткам. Гэта добра — ёсць з чаго выбраць матэрыял для будучага фарміравання пальметы. З іншага боку, асноўную масу ваўчкоў трэба выдаляць. Карані ж пры гэтым працягваюць працаваць і абуджаць маладыя пупышкі. Зноў з'яўляюцца ваўчкі, і зноў іх давядзецца выдаляць!

Абразанне

Амаладжальнае абразанне праводзяць у адсутнасць моцнага руху соку — позняй восенню або ранняй вясной.

Калі гаворка ідзе пра амаладжэнне старога дрэва — асаблівага ўраджаю ў першы сезон чакаць не варта. Пры кардынальным абразанні (часам застаецца толькі стары штамб, ад якога чакаеш з'яўлення парасткаў) утворацца даволі вялікія па плошчы спілы. Іх трэба засцерагаць. Ад марозу (гэта зрабіць лягчэй) — мешкавіна, садовы вар, фарба. Ад вясновага соку (яго ціск бывае да 2-3 атмасфер) засцерагчы цяжэй. А ад гэтага — мокнучыя зрэзы і гніль!

Алейную зялёную (з медзезмяшчальным пігментам) фарбу або сурык на пакосце, у крайнім выпадку медны купарвас або бардоскую сумесь, замяшаную на пакосце, награваюць на вадзяной лазні для надання пластычнасці. Спілы і кару ніжэй за іх два-тры разы пакрываюць фарбай. Накладваюць цёплы садовы вар (гэта значыць воск) і ўціскаюць у яго кавалак рагожы або мешкавіны. Зверху таксама абмазваюць варам. Звычайна такога пласта «кары» дастаткова для прадухілення прамярзання драўніны.

Алейная фарба надзейна закрывае капіляры драўніны, і вясновы сок са спілаў не выходзіць.

СЁННЯ

Месяц

Апошняя квадра 15 сакавіка.
Месяц у сузор'і Казярога.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.23	19.15	11.52
Віцебск —	7.13	19.04	11.51
Магілёў —	7.13	19.05	11.52
Гомель —	7.09	19.02	11.53
Гродна —	7.38	19.30	11.52
Брэст —	7.38	19.31	11.53

Імяніны

Пр. Васіліска, Зянона.
К. Ізабелы, Гіляра, Рэната.

Фота Ірыны СІДАРОК.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

16 САКАВІКА

У краіне

1888 год — нарадзіўся Аляксей Канідзеевіч Флегантаў, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Ініцыятар стварэння і камандзір партызанскага атрада, які ў 1942-м быў накіраваны на тэрыторыю акупаванай Беларусі. У 1942—1943 гг. — камандзір партызанскай брыгады «За Радзіму», якая дзейнічала на тэрыторыі Брэсцкай, Магілёўскай і Мінскай абласцей. Загінуў у баі ў 1943-м. У Чэрвені яму ўстаноўлены помнік.

1898 год — нарадзіўся Марк Эмануілавіч Шнэйдэрман, беларускі дырыжор, кампазітар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. У 1935—1947 гг. — дырыжор Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі, у 1947—1957 гг. — мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор сімфанічнага аркестра Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

1958 год — нарадзілася Марына Аляксандраўна Мажэйка, беларускі філосаф, доктар філасофскіх навук, прафесар.

1963 год — устаноўлена ганаровае званне «Заслужаны лесавод Беларускай ССР» (з 13 красавіка 1995 г. — «Заслужаны лесавод Рэспублікі Беларусь»).

1993 год — заснаваны Івацэвіцкі гісторыка-краязнаўчы музей.

У свеце

1903 год — нарадзілася Тамара Рыгораўна Габэ, расійская пісьменніца, літаратуразнаўца, літаратурны крытык. Аўтар п'ес «Аўдоцця Разаначка», «Жан Бясстрашны», «Горад майстроў, або Казка аб двух гарбунах».

1918 год — нарадзіўся Фрыдэрык Райнес, амерыканскі навуковец, прафесар, член НАН ЗША, замежны член Расійскай АН, нобелеўскі лаўрэат. Продкі Райнеса — выхадцы з Беларусі. Удзельнічаў у распрацоўцы і выпрабаваннях атамнай і ядзернай зброі. Аўтар навуковых прац па фізіцы элементарных часціц, фізіцы касмічных прамянёў і нейтрына, радыебіялогіі. Яго працы ляжаць у аснове ўсіх сучасных метадаў выяўлення нейтрыннага выпраменьвання.

1923 год — нарадзіўся Валерый Уладзіміравіч Мядзведзеў (Марынін), расійскі дзіцячы пісьменнік. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РСФСР імя Н. К. Крупскай.

1953 год — нарадзілася Ізабель Юпэр, французская актрыса тэатра і кіно.

Так гаварыў...

ВАЛЬТЭР:

«Толькі слабыя робяць злачынствы: моцнаму і шчасліваму яны не патрэбныя».

УСМІХНЕМСЯ

— І як ты расходуеш свой заробак?

— 40 % — на ежу, 30 % — на «камуналку», 30 % — на адзенне, 20 % — на забавы і непрадбачаныя выдаткі.

— Але гэта ж у суме атрымліваецца 120 %!

— У тым і праблема.

Прайшло амаль тры месяцы новага года. Пачынаю падазраваць, што кахання і грошай мне жадалі няшчыра...

— Я ўжо больш не хаваю ад жонкі заначку.

— Няма куды?

— Няма чаго!

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.681. Індэкс 63850. Зак. № 651. Нумар падпісаны ў 19.30 15 сакавіка 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12